Літаратурная Беларусь

Выпуск №4 (92)
(красавік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест

Дзе мы?*



Ігар ДРАКО



Гадоў восем назад гутарыў з навуковымі мужамі з Акадэміі навук пра ідэнтычнасць беларусаў. Людзі былі розных узростаў, прытрымваліся розных палітычных поглядаў, іх навуковыя інтарэсы сягалі ў розныя сферы, але сустрэча праходзіла ў межах міждысцыплінарнага клуба, і кожны (нават той, хто не прачытаў ніводнага артыкула, які тычыўся б нацыянальнай ідэнтычнасці) меў права выказацца па тэме.

Фармат вольнай дыскусіі добры і дрэнны адначасова. Добры — бо можна не стрымліваць сябе панятказым і катэгарыяльным апаратам; дрэнны — бо паважаныя навукоўцы ў такой дыскусіі становяцца занадта непасрэднымі і, хоць і прызнаныя адмыслоўцы ў сваёй галіне, нярэдка кажуць усялякую лухту пра прадмет, мала ім знаёмы, але які іх хвалюе (як неабыякавых і крытычна думаючых грамадзян).

Напрыклад, адзін з прысутных там «тэхнароў» даў мне параду абавязкова прачытаць, што казаў Сталін пра нацыянальнае пытанне. Я спытаў: «Чаму вы думаеце, што я не ведаю, што ён казаў з гэтай нагоды? А калі б і не ведаў?.. Няўжо нельга разважаць пра нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў без такіх ведаў?». На што атрымаў адказ: «Вядома ж, не! Мы ўваходзілі ў склад СССР, таму тое, што казалі пра нацыянальнае пытанне кіраўнікі Савецкага Саюза, надзвычай важна для разумення нас сённяшніх».

Далей у нашую спрэчку ўступіў яшчэ адзін удзельнік дыскусіі (таксама тэхнар):

«Чытаць Сталіна трэба таму, што ён меў сваё разуменне нацыянальнага пытання, ці таму, што на яго можна абапірацца ў пабудове канцэпцыі нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў?»

«Другое», — адказаў першы тэхнар.

«Ну вы даяце!» — сказаў другі.

«А што, толькі новамодныя аўтары валодаюць правам на праўду?»

«Зусім не!»

«Ды вы самі Сталіна чыталі?»

Спрэчка пагражала перарасці ў лаянку, таму астатнія ўдзельнікі дыскусіі пачалі заклікаць да парадку, і мадэратар, якому былі дэлегаваны паўнамоцтвы даваць слова і перарываць выступоўцаў, вярнуў абмен меркаваннямі ў «канструктыўнае рэчышча»...

Я прывёў гэты фрагмент дыскусіі васьмігадовай даўнасці зусім не дзеля таго, каб перасцерагчы: будзьце асцярожныя, у Акадэміі навук усё яшчэ працуюць «сталіністы», якія вельмі спецыфічна тлумачаць перспектывы самаідэнтыфікацыі беларусаў. На той сустрэчы казалі шмат цікавых рэчаў (асабліва тыя ж «тэхнары», якія найперш ставілі пытанні адносна падыходаў да вывучэння тэмы ідэнтычнасці, а не сцвярджалі нешта сваё). Сюжэт пра Сталіна мне запомніўся з прычыны празмернай эмацыйнасці.

Адна з маіх рэплік таксама была сустрэта даволі эмацыйна. Я сказаў, што «пануючая рэлігія ў Беларусі — зусім не хрысціянства, а канфуцыянства». І далей тлумачыў прыкладна так: «Тое, што знаходзіцца за межамі гэтага свету, нам глыбока абыякава. Мы, беларусы, вельмі зямныя, тутэйшыя, і нашае знаходжанне на зямлі мы не суадносім з вечнасцю, пра якую нам распавядаюць у цэрквах і касцёлах. Канфуцыянства — адзіная рэлігія, якая атрымала пачатак не ад Бога, а ад звычайнага смяротнага, не патрабуе ад людзей ні духоўнага подзвігу, ні нейкай аскезы перад тварам немінучай сустрэчы з Богам. Акрамя гэтага, вучэнне Канфуцыя ўяўляе сабою збор правілаў паводзін. Гэты збор не палохае грахамі, за якія давядзецца расплочвацца на судзе Божым. Ён вучыць, як трэба сябе паводзіць на зямлі, каб быў парадак. А парадак нараджаецца толькі з падначалення таму, хто вышэй цябе на сацыяльных прыступках. Службовец-чыноўнік — вось на кім трымаецца дзяржава, і не спрачайся з ім, бо ён больш адукаваны, чым ты, і паставіў яго службоўцам хтосьці яшчэ больш дасведчаны. Самы ж прасветлены — імператар, і ўў яго ў падначаленні не можа быць кепскіх службоўцаў».

Я тады змог развесяліць публіку. Вядома, мая канцэпцыя пра «канфуцыянскую Беларусь» умоўная. Яна так і была ўспрынята. Аднак з фактам дамінавання ў нашым грамадстве службоўцаў ніхто спрачацца не стаў. Усе пагадзіліся, што ў Беларусі наогул занадта шмат дзяржавы. «Занадта» — значыць, можна і трэба скарачаць.

Але гэта было агучана падчас дыскусіі навукоўцаў. Што б сказалі беларускія грамадзяне, якія не стамляюць сябе асэнсоўваннем узаемадзеяння грамадства і ўлады?

Думаю, сказалі б некалькі кепскіх слоў у адрас пэўных службоўцаў і выступілі б за скарачэнне чынавенскага штата. Праўда, на пытанне «Ці будзеце вы супраць, калі ваш сын (дачка) пойдзе на дзяржслужбу?» адказ «Не» далі б большасць рэспандэнтаў. Чынавенская пасада ў Беларусі, як і ў Кітаі, лічыцца прэстыжнай. А ў Францыі — не. Тады дзе мы: у Еўропе ці Азіі?

«Я начальнік — ты дурань, ты начальнік — я дурань». Па-мойму, беларускае канфуцыянства вычарпальна апісваецца гэтай жыццёвай мудрасцю.

Аднак Кітай даў свету не толькі Канфуцыя, але і Лао-Цзы з яго вучэннем пра Дао.

Дао — гэта шлях, закон, лёс... Тое, што забяспечвае гармонію ўсяго існага. Галоўны прынцып даасізму — прынцып у-вэй, недзеі. Гармонія свету ўсталявана, і лепшае, што ты можаш рабіць, не парушаць яе сваімі дзеяннямі.

У мяне складваецца ўражанне, што ў Беларусі прыжылося не толькі канфуцыянства як форма чынашанавання. Даасізм, пераадолеўшы сваю «прывязку» да асобнага чалавека ў яго ўзаемадзеянні з Сусветам, стаў у Беларусі палітычнай і (шырэй) сацыяльнай дактрынай.

Рацыянальны (усё адно які: заходне-пратэстанцкі ці ўсходне-канфуцыянскі) падыход настойвае на правядзенні ў Беларусі эканамічных рэформаў. І што? Рэформаў няма. Чаму? Бо рэформы — гэта дзея, парушэнне эканамічнай гармоніі, якая заключаецца ў «сядзенні на нафтавай трубе» і вытворчасці тавараў на склад.

А хто ў дзяржаве вызначае, як павінны весціся справы? Правільна: службоўцы на чале з імператарам. Калі пачынаць рэформы, то прыйдзецца прызнаць, што раней імператар вёў справы неналежным чынам, а такога быць не можа, бо імператар ніколі не памыляецца.

Хоць у тым жа Кітаі ўсё вышэйшае кіраўніцтва краіны змяняецца раз у дзесяць гадоў. Менавіта ратацыя кадраў дазваляе пазбягаць вялікіх памылак. Але ж тое ў Кітаі, а мы не зусім кітайцы, бо наш кіраўнік ва ўладзе ўжо дваццаць гадоў і сыходзіць на пенсію не збіраецца.

Па вялікім рахунку, ён і з карупцыяй змагацца не павінен, бо сам яе і спарадзіў. Карупцыя ёсць элемент гарманічнай сістэмы, выбудаванай прасветленым імператарам.

Грамадства ў цэлым з гэтым згоднае.

Навуковыя мужы папярэджваюць: чым пазней пачнём праводзіць рэформы, тым хваравіцей яны будуць праходзіць. Што яны чуюць у адказ? Нічога, бо даосаў, якія па-канфуцыянску давяраюць службоўцам, будучыняй напалохаць нельга. Калі прыйдуць рэформы, тады і прыйдуць. Ад лёсу не ўцячэш.

Ды што рэформы!.. Даосаў і рэзкай зменай улады не спалохаеш. Калі заўтра іх нязменны імператар будзе, як Бакіеў ці Януковіч, уцякаць без аглядкі з краіны ці, наадварот, не паспее ўцячы і будзе арыштаваны ці нават пакараны сваімі былымі падпарадкаванцамі, то даосы-беларусы адстаронена скажуць: «Раней усталяваная гармонія патрабуе ахвяр». Нельга ўмешвацца ў натуральны ход рэчаў.

Але чаго ж у такім выпадку іх так расхвалявалі Майдан і Крым? Адкажу: багаццем дзеянняў. Украінцы і расіяне, самі таго не жадаючы, разбурылі гармонію беларускага соцыума. Цікава, што гэтыя падзеі для абедзвюх нацый — украінскай і расійскай — сталі рухавіком іх самаідэнтыфікацыі. Украіна і Расія дзякуючы канфлікту нібы рэанімавалі свае праекты нацыябудаўніцтва.

Мы ж пакуль з усіх сілаў устрымліваемся ад дзеяння. І, можа быць, устрыманне ад актыўнай рэалізацыі нацыянальнага праекта і ёсць чыннік разбурэння гармоніі «беларускасці», бо ўстрыманне — таксама род дзеяння.

Таму не варта блытаць цяжкадасяжны стан у-вэй са звычайным нічоганеробленнем, што абавязкова суправаджаецца рытарычным пытаннем: «А мо так і трэба?».

naviny.by

* Назва і пераклад з расійскай мовы Рэдакцыі.

Саюзнае папаўненне

На чарговым пасяджэнні Рады ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» адбыўся прыём новых сяброў. Імі сталі Валянцін Дубатоўка, Кацярына Оаро і Алег Наважылаў.





Валянцін Яўгенавіч Дубатоўка — пісьменнік, краязнавец, мецэнат. Нарадзіўся 20 ліпеня 1963 года ў вёсцы Александрыя Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1981 годзе скончыў Дзярэчынскую сярэднюю школу, у 1982-м — электратэхнічнае вучылішча ў Гродне. У 1982–1984 гадах служыў у Савецкай Арміі, пасля дэмабілізацыі служыў у пажарнай ахове на прадпрыемстве «Азот». У 1990-х стаў заснавальнікам і кіраўніком камерцыйных структур. Фундаваў кнігі: факсімільнае выданне Ларысы Геніюш «Ад родных ніў», Міхася Скоблы «Розгі ў розніцу», Юркі Голуба «Багра» ды інш. У касцёле Дзярэчына намаганнямі В. Дубатоўкі ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар удзельніка паўстання 1830 года Яўстаха Каятана Сапегі, а ў Зэльвенскай праваслаўнай царкве з'явілася дошка памяці Ларысы Геніюш.

Пісаць пачаў яшчэ ў школьныя гады, друкаваўся ў Зэльвенскай раённай газеце «Праца». Выступаў як аўтар тэкстаў песень для гродзенскіх музычных калектываў. Проза і вершы публікаваліся ў «Гродзенскай праўдзе», «Дзелавой газеце», у часопісах «Роднае Слова», «Дзеяслоў». Выдаў кнігу даследаванняў і вершаў «Архіпелаг Сапегаў» і кнігу прозы «Чорная Воля».

Кацярына Уладзіміраўна Оаро (у дзявоцтве Юркевіч) — журналістка, празаік. Нарадзілася 4 верасня 1986 года ў Адэсе (амаль адразу сям'я пераехала ў Ялту, дзе Кацярына пражыла 7 гадоў і пайшла ў школу). У 1993 годзе разам з бацькамі пераехала ў Беларусь, у г. Івацэвічы Брэсцкай вобласці, дзе скончыла школу і ліцэй. Пасля вучылася ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Скончыла Беларускі Калегіюм. З 2008 па 2013 вучылася ў Літаратурным інстытуце імя Горкага ў Маскве на аддзяленні прозы. Працавала журналістам у розных выданнях і на радыё, выкладчыкам расійскай мовы і літаратуры.

З 2013 года жыве ў г. Ліль (Францыя).

У 2013 годзе выдала ў серыі «Пункт адліку» СБП дэбютную кнігу «Сарочае радыё», за якую атрымала прэмію «Дэбют» імя Максіма Багдановіча ў галіне прозы.

Алег Аляксеевіч Наважылаў — паэт, празаік, драматург.



Нарадзіўся 7 жніўня 1935 года ў Самаркандзе (Узбекістан). Закончыў Ленінградскі электратэхнічны інстытут сувязі, па размеркаванні прыехаў працаваць у Гродна. Некаторы час жыў у Манголіі, пасля ва Узбекістане, цяпер — у Гродне.


Піша на расійскай мове. Першыя публікацыі апавяданняў былі ў «Гродзенскай праўдзе» (пры падтрымцы і рэдагаванні Васіля Быкава). Апавяданні публікаваліся ў часопісах «Маладосць», «Полымя», «Беларуская думка», газеце «Літаратура і мастацтва» ды інш. Аўтар кнігі апавяданняў «Агатовый ручей», зборнікаў вершаў «Берег» і «Серебро луны»; асобнай кнігай была выдадзена п'еса «Железная свадьба».

Прэсавая служба СБП

ТРАВЕНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

04.05.1959 — Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак
06.05.1954 — Алег Аблажэй
06.05.1949 — Яўгенія Яўгенаўна Казлова
13.05.1949 — Мікалай Андрэевіч Захаранка
13.05.1939 — Аляксей Георгіевіч Філатаў
14.05.1959 — Міхась Васільевіч Амялішка
22.05.1959 — Мікалай Адамавіч Яцкоў
23.05.1964 — Ірына Міхайлаўна Дубянецкая
24.05.1949 — Тамара Пятроўна Аўсяннікава
24.05.1979 — Павал Сяргеевіч Касцюкевіч



Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

«Балтыйскія сустрэчы»

У шведскім горадзе Вісбю, што на востраве Готланд, у пяты раз прайшлі так званыя «Балтыйскія сустрэчы» (Baltic Meeting), у якіх узялі ўдзел і беларускія літаратары.



Дыскусія, прысвечаная множнай ідэнтычнасці літаратурнага перакладчыка: Стэфан Інгварсан, Яніна Арлоў, Яаана Нікула, Казімера Астравайтэ, Мудзітэ Трэйман. Фота Юлі Цімафеевай

Традыцыйным арганізатарам «Балтыйскіх сустрэчаў» выступае Балтыйская пісьменніцкая Рада, у якую ўваходзіць 21 літаратурная арганізацыя з 12 краінаў Балтыйскага рэгіёна. Саюз беларускіх пісьменнікаў з 2008 года таксама з'яўляецца сябрам Балтыйскай пісьменніцкай Рады.

Сёлетняй тэмай мерапрыемстваў быў абраны канцэпт «ідэнтычнасці», гучала яна «Двайное ядро Еўропы».

У гарадской бібліятэцы Альмедален праходзілі літаратурныя чытанні і публічныя дыскусіі, прысвечаныя моўнай ідэнтычнасці, ідэнтычнасці перакладчыка, нацыянальнай ідэнтычнасці.

Галоўнымі літаратурнымі падзеямі «Балтыйскіх сустрэчаў» былі выступы шведска-беларускага паэта, перакладчыка і драматурга Дзмітрыя Плакса і фінска-эстонскай пісьменніцы Сафі Оксанэн.

Прэсавая служба СБП

«Гумар — найлепшая дапамога»

2 красавіка адзначаўся Міжнародны дзень дзіцячай кнігі. Саюз беларускіх пісьменнікаў запамінальна адзначыў гэтае свята — падарыўшы дзеткам Беларусі кнігу «Найлепшы спявак у свеце». Гэта казка шведскага пісьменніка Ульфа Нільсана, ілюстраваная мастачкай Эвай Эрыксан. Кніга выйшла ў дзіцячай серыі СБП «Каляровы ровар».





Алеся Башарымава. Фота Алены Казловай

Па-беларуску казка загучала дзякуючы перакладчыцы Алесі Башарымавай, якая, адна з першых атрымаўшы выданне, адказала на нашыя пытанні.

— Чым прывабіла цябе кніга — як перакладчыка і як чытача? З якімі складанасцямі сутыкнулася ў працэсе перакладу?

— Пераклад кніжак у малюнках, або так званых «кніжак-карцінак» — новы для мяне досвед, і калі Саюз беларускіх пісьменнікаў прапанаваў мне перакласці спярша «Снежнага чалавека» Эвы Суса, а потым «Найлепшага спевака...», то я ўзялася за гэта з цікаўнасці. Абедзве кнігі напісаныя простаю мовай, з разлікам на зусім маленькіх дзяцей. Пад простай мовай я тут маю на ўвазе лёгкасць сінтаксічных канструкцый, і тое, што для перадачы сэнсу выкарыстоўваецца досыць мала словаў, калі працуюць асацыяцыі. Перада мной стаяла задача захаваць гэтую простасць.

«Найлепшы спявак у свеце» — гэта гісторыя хлопчыка, які любіў спяваць, але саромеўся рабіць гэта перад публікай, гісторыя таго, як ён перамог гэты комплекс. Яна апісаная з лагодным гумарам, і я думаю, тыя, хто пазнае сябе ў герою, гэта ацэняць і змогуць па-іншаму паглядзець на свае праблемы (якія цалкам могуць аказацца ўяўнымі). А гумар у такім выпадку можа быць найлепшай дапамогай.

Увогуле, калі чытаеш гэтую кнігу, вельмі добра бачна, што абодва аўтары — аўтар тэксту і аўтарка ілюстрацый — з вялікай пяшчотай ставяцца да героя і апісваюць яго гісторыю.

Калі казаць пра нейкія адметныя складанасці, з якімі я сутыкнулася, то можна згадаць пераклад назваў песенек, якія спявае галоўны герой свайму малодшаму брату. У арыгінале абедзве песні вядомыя, бадай, усім шведскім дзецям. Мне ж хацелася падабраць нейкія больш-менш пазнавальныя беларускія дзіцячыя песні, але зрабіць гэта было нялёгка. У беларускай версіі кнігі галоўны герой спявае «Дзеда Барадзеда» і «Саўку ды Грышку». Падазраю, што сённяшнія дзеці нават не чулі і таго «Дзеда Барадзеда», але ў такім разе, спадзяюся, зацікавяцца ды, скажам, паслухаюць песню ў інтэрнэце.

— Ці праўда, што каб займацца дзіцячай літаратурай (пісаць або перакладаць яе), даросламу самому трэба ў душы быць дзіцёнкам?

— Гэтая думка паўтараецца так шмат, што даўно зрабілася банальнасцю. Такая фармулёўка ставіць паняцці «дарослы» і «дзіця» ў пазіцыю канфрантацыі і гэтым выдатна падмацоўвае, напрыклад, стэрэатып аб тым, што дзіцячая літаратура — нешта несур'ёзнае і другараднае.

Пытання наконт таго, кім, якім трэба быць у душы, каб займацца якой бы там ні было літаратурай, стаяць увогуле не мусіць. Проста літаратура, верагодна, будзе ў кожным выпадку рознай. І падабацца будзе рознаму чытачу.

Камусьці здаецца забаўным, вясёлым чытвом тое, у чым іншы бачыць ненатуральнасць. Камусьці падабаецца чытаць тое, што іншаму здаецца нудным і нецікавым. Дзеці ж таксама розныя. Хтосьці, напрыклад, марыць як хутчэй «праскочыць» дзяцінства, бо адчувае сябе не на сваім месцы. І нішто не замінае яму напісаць потым дзіцячую кнігу, нудную да захапляльнасці...

У «Спеваку» мы бачым, як апавядальнік мімікруе пад дзіця — галоўнага героя. Не ведаю, як успрымуць гэта юныя чытачы, але для мяне гэтыя спробы выглядаюць досыць кранальна. Усё ж такі адчуваецца, што апавядальнік тут зусім іншы — не герой-дзіця, а той, хто акуратна вядзе гэтае дзіця праз цяжкасці і ўрэшце прыводзіць да шчаслівай развязкі.

— Якія шведскія аўтары прывабныя для цябе, каго б яшчэ хацела перакласці?

— Акурат бліжэйшым часам збіраюся вярнуцца да перакладу кнігі Гунэль Ліндэ «Белы каменьчык» (пачатак друкаваўся ў часопісе «Дзеяслоў»). Гэтую кніжку я купіла амаль выпадкова ў шведскім букіністычнай, а ў выніку яна настолькі мяне ўразіла, што я адразу вырашыла яе перакласці.

«Найлепшага спевака ў свеце» можна знайсці ў мінскіх крамах «Акадэмкніга», «Кнігарня пісьменніка», «Книги&кнжечки», кнігарнях «ЛогвінаЎ», «Галіяфы» і «Веды».

Віка Трэнас, lit-bel.org


Сябравалі два таленты

Ілля СЛАВІНСКІ

Ён стаў членам Саюза беларускіх пісьменнікаў у 20 гадоў, ад моманту заснавання арганізацыі ў 1934 годзе. У 11-гадовым узросце была першая крытычная публікацыя, а праз год — першы надрукаваны верш...



Аркадзь Куляшоў з Максімам Танкам. 1975 г.



Аркадзь Куляшоў і Міхась Лынькоў на Нарачы ў 1973-м



Аркадзь Куляшоў падпісвае кнігу Аляксандру Твардоўскаму. 1949 г.



Давід Кугульцінаў, Аркадзь Куляшоў і Пімен Панчанка. 1973 г.

Аднойчы, калі Аркадзь Куляшоў з цяжкасцю акрыяў пасля зацяжной хваробы, Аляксандр Твардоўскі, жартам, сказаў яму: «Эх, Аркадзь, якія вершы збіраўся я напісаць на тваю смерць...».

Цяпер жа мы ведаем, што здарылася ўсё наадварот: вялікі рускі паэт сыйшоў з жыцця раней, а беларускі класік прысвяціў яго памяці паэму «Варшаўскі шлях». Але пагадзіцеся, што так жорстка жартаваць маглі толькі вельмі блізкія людзі.

І яны сапраўды былі блізкія. З той самай першай сустрэчы, пра якую Аркадзь Аляксандравіч успамінаў: «Гэта было ўвесну, хутчэй за ўсё ў 1935 годзе. Я зайшоў у наш менскі Дом літаратара і бачу: сядзіць за столікам Аляксандр Твардоўскі і чытае газету «Літаратура і мастацтва», і бачу, што чытае ўрывак з маёй паэмы «Гарбун». Прачытаў і кажа мне, што ў ім дрэнныя два месцы: тое, дзе я пішу, што Анісіма Шкробу ў першыя гады рэвалюцыі наведвалі эсэры, і другое, што ён, гэта значыць Шкроб, меў «шырокі кулацкі зад». Першае дрэнна таму, што эсэры, маўляў, гэта не купцы, не крамнікі і нават не папы, каб ужываць гэтае слова ў зборным сэнсе, а другое, маўляў, таму, што «шырокі зад» — месца агульнае, і, маўляў, ёсць кулакі і без «шырокага заду». Заўвагі, зробленыя ім па маёй паэме «Гарбун», зрабілі на мяне моцнае ўражанне. Твардоўскі быў для мяне чалавекам малавядомым, а заўвагі яго я прыняў адразу і адчуў, што яны зыходзяць ад спелага майстра».

Цяжка сказаць, якімі былі б іх далейшыя адносіны, калі б гэтыя заўвагі Куляшоў успрыняў інакш... Але ёсць і не меней удзячныя прызнанні. Адказваючы на пытанні анкеты часопіса «Юность», Куляшоў сказаў большае: «...Па сутнасці, да канца я зразумеў, што павінен рабіць у літаратуры, калі прачытаў паэму Твардоўскага «Краіна Муравія»... Як я ўдзячны таму, што сустрэў гэту кнігу ў савецкай літаратуры! Захацелася свой назапашаны досвед, назіранні і разважанні над народным жыццём зрабіць прадметам мастацтва». І ён выдатна здолеў ажыццявіць гэтае жаданне. Не без сяброўскай падтрымкі Аляксандра Трыфанавіча.

Невыпадкова менавіта на кватэры апошняга адбылося і першае чытанне знакамітай паэмы Куляшова «Сцяг брыгады». Вось як успамінаў пра гэта Твардоўскі. «Зімой 1942 года ў адной з маскоўскіх кватэр сабраўся сяброўскі кружок пісьменнікаў паслухаць беларускага паэта Аркадзя Куляшова, які прыбыў з фронта з новай паэмай у палявой сумцы. Першапачатковае знаёмства з гэтай рэччу — адно з самых яркіх і дарагіх для мяне літаратурных успамінаў ваеннага часу... З першых жа раздзелаў паэмы, прачытаных аўтарам, стала ясна, што ён проста не мог не напісаць яе. Гэта было слова, якое не чакае асаблівых знешніх умоў, каб з'явіцца з сэрца паэта, а нават хутчэй за ўсё і натуральней можа з'явіцца тады менавіта, калі цяжка. І чым далей чытаў Куляшоў, тым усё часцей мы прасілі паўтарыць асобныя месцы і парываліся зазірнуць у рукапіс сваім вокам, яшчэ раз пераканацца, што яны ёсць насамрэч, гэтыя простыя і поўныя вялікай навізны і сілы словы і радкі, якія бяруць за душу...»

Пачуць такое ад паэта, які сказаў аднойчы: «А всего иного пуще не прожить наверняка — без чего? — Без правды сущей, правды, прямо в душу бьющей, / Да была б она погуще,/ как бы ни была горька», — мала каму даводзілася. Я прывёў толькі некалькі слоў з легендарнай паэмы пра Васіля Цёркіна. Але ці многія ведаюць, што такі ж вясёлы і вынаходлівы герой жыў на старонках іншай франтавой газеты ў больш за восемдзесят вершах Аркадзя Куляшова. Толькі звалі таго героя — Аляксей Пятроў...

Нікога з беларускіх паэтаў так ахвотна не публікаваў Аляксандр Трыфанавіч у «Новом мире», як яго. Менавіта там з'явілася ў 1953 годзе паэма «Граніца», рэгулярна публікаваліся вершы і рэцэнзіі на новыя кнігі Куляшова

Наогул, пра роднасць гэтых паэтаў напісана многа, але далёка не ўсё. Яны пераклікаюцца паэмамі дзесяцці на вяршынях паэтычнага ўсведамлення аднаго і таго ж народнага жыцця. «Краіна Муравія», «Васілій Цёркін», «Дом ля дарогі», «За даллю — даль» Твардоўскага — і «Сцяг брыгады», «Простыя людзі», «Далёка да акіяна», «Хамуціус» — у беларускага паэта. Зрэшты, пераклічка адчувальная не толькі ў паэмах, але і ў вершах.

Нікога з беларускіх паэтаў так ахвотна не публікаваў Аляксандр Трыфанавіч у «Новом мире», як яго. Менавіта там з'явілася ў 1953 годзе паэма «Граніца», рэгулярна публікаваліся вершы і рэцэнзіі на новыя кнігі Куляшова. Дарэчы, рэдкалегіяй гэтага выдання ён быў вылучаны на спашуканне Ленінскай прэміі. Дванаццаць гадоў сам уваходзіў у яе склад. Дзве грунтоўныя рэцэнзіі пра творчасць свайго сябра напісаў Твардоўскі. Адна з іх — пра паэму «Сцяг брыгады» — заканчваецца так: «Але непаўторная свежасць упершыню сказанага пра гэтую барацьбу па-сапраўднаму паэтычнага слова не адымаецца ў лепшых твораў, напісаных у гады самой барацьбы. Паэма Куляшова несумнеўна належыць да гэтага шэрагу твораў».

6 лютага споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Куляшова — народнага паэта Беларусі, двойчы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (памёр 4 лютага 1978-га). У яго лёсе ўражвае многае. І першым чынам фантастычна ранні пачатак творчага шляху: першы верш апублікаваў у Клімавіцкай акруговай газеце ў 12 гадоў, а потым у рэспубліканскім часопісе «Полымя» з'явіўся верш «Бывай». Так, той самы, які дзякуючы музыцы Ігара Лучанка трывожыць пранікнёнай песеннай пяшчотай кожнага з нас.

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

Можаце ўявіць, што гэта напісана 14-гадовым хлопцам? Натхніла юнага паэта рэальная прыгажуня Алеся Карыткіна. Гэтае амаль дзіцячае захапленне Куляшоў пранёс скрозь усё сваё паэтычнае жыццё...

У адным з лістоў Твардоўскага, апублікаваным у часопісе «Нёман», чытаем: «Дарагі Аркадзе! Вось што мне прыйшло на думку нейк: ты павінен засесці за аўтабіяграфічную аповесць, — ты мне сёе-тое распавядаў пра сваё дзяцінства, памятаецца, там ёсць выдатнейшыя эскізы, напрыклад, як ты жыў хлапчанём адзін у хаце, і да т.п. Упэўнены, што атрымаецца. Для запалу пачытай «Дзяцінства» Талстога, Горкага, Караленкі, Герцэна, нават Рылянкова...» Так, два шчырых таленты ўмелі шчыра сябраваць.

І зноў у памяці ўсплываюць радкі з «Варшаўскага шляху», напісаныя ў 1972 годзе:

Вайна ягоны век укараціла?..
Хвароба?.. Не!
Не падуладна ім
Любоў да працы прагнай, што спаліла
Звышчалавечым высілкам сваім
Яго жыццё, нібы маланка лёс,
Які ў агні самазнішчальным згінуў.
Не веру я, што Пушкіна Дантэс,
Што Лермантава некалі Мартынаў
Забіў. Не веру!
Волатаў скасіла
Паэзія, а ворагі — пасля,
Ясеніна — яна, а не пятля.

Усім такія словы гаварыла
Паэзія, калі вяла ў паход:
«Не вер, што свет шырок, ён думкам цесны.
Хай ісціны старэюць з году ў год,
Хай сэрца разрывае гук жалезны,
А ты за ўсё ў адказе, мой балесны,
За справу, за дзяржаву, за народ.
Далёкае разгледзь арліным вокам,
Лаві на слых ледзь чутны крок бяды:
Мяне абраўшы, мусіш быць прарокам.
Як не прарокам,
кім жа быць тады?
Не бойся слова гучнага — прарок! –
Прарок не бога — праўды слых і зрок.

Адрасаваныя радкі гэтыя Куляшовым Аляксандру Твардоўскаму і, вядома ж, самому сабе. Бо ім заўсёды наканавана па-сяброўску заставацца побач на абшарах паэтычнай вечнасці.

«ЛГ». Пераклад з расійскай мовы.



Безназоўнае



Сяргей ВЕРАЦІЛА

Спачатку яно шалясцела
Вельмі нясмела...
Назаўтра ўзняло галасочак,
Нібы званочак...
На трэці дзень чуцен быў гоман,
Хоць і надломан...
А далей яно зашумела
Надта ўжо смела...

Янка КУПАЛА

Маўчанне, маўчанне, маўчанне, потым зноў маўчанне. Так, хаця і маўчанне, але не безгалоссе. І ад маўчання — масток — у Мову. Маўчанне не азначае безгалоссе, бязгучча. Гукі паўсюдна і адусюль, яны ў вясновых грымотах, у шалахценні ліпеньскае лістоты, у ашалелым кастрычніцкім дажджы, што бесперапынна шуміць па даху, у патрэскванні абмёрзлага снегу, у рыпенні варотаў і ў бразгаце ключоў, у ранішнім звароце пеўня да сонца і ў начным скавытанні сабакі: адчайным і бязвыйсным. І ўсе гэтыя і яшчэ шмат якія гукі й галасы складаюць разам музыку. Музыка абкружае чалавека, яна жыве разам з ім ад першага ягонага подыху, пачынаючыся як плач, і плачам завяршае ягонае жыццё па адыходзе, і гэты апошні факт якраз паказвае на тое, што нават і калі спыняецца подых, музыка не пакідае чалавека. Праўда, нам уся гэта музыка можа падацца незгарманізаванаю, можа, таму, што мы папросту не здольныя зразумець і ўспрыняць усю ейную гармонію, а таму яна падаецца нам не цэласнаю паліфаніяй, а раздрабнёнаю на мноства адрозных фрагментаў. І толькі таму, што мы чуем музыку як перарывістую, мы наогул здатныя яе чуць. Калі б мы не ўспрымалі яе такім чынам, дык пры нашым узроўні развіцця глыбіннага слыху мы б наогул не чулі аніякае музыкі і пачуваліся б глухімі сярод безгалосых. І хаця гукі можна налічваць дзясяткамі, тысячамі, мільярдамі, нашае вуха няздатнае да ўспрыняцця самых нізкіх і самых высокіх сярод іх: рушэнне чарвяка пасярод сырых каранёў і найтанчэйшых мелодыяў нябёсных сфераў. Неарганізаваныя, незгарманізаваныя ў прывычныя нам лады мелодыі ўяўляюцца нашаму ўспрыманню адно толькі Хаосам, суцэльным і першапачатковым. І мы стараемся адгарадзіцца ад яго, выбудоўваючы парадак у выглядзе паслядоўна-лагічнага чаргавання гукаў, і гэты свой парадак мы называем космасам, часам пачуваемся ў гэтым нашым космасе даволі ўтульна ці, лепш сказаць, звыкла. Але гэткі космас не мае амаль нічога супольнага з сапраўдным Космасам, бездані якога палохаюць позіркі нават самых смелых сярод нас, бо судакрануцца з ягонымі глыбінямі азначае дакрануцца да Бога. А Бог палохае нас нават самім фактам свайго існавання, ужо не кажучы пра цалкам незразумелую і невытлумачальную ягоную бясконцую міласэрнасць да нас і як да асобінаў, і так да ўсяго нашага роду, калі нават мы самі часам успрымаем сваё існаванне як недарэчную і фатальную памылку. Каханне даведзенае да абсалюта, каханне, узведзенае ў абсалют, каханне, скіраванае ад абсалюта. Ці не аднолькавае меры Хаос і Космас уяўляюцца нам страшкімі, палохаючымі і няўцямнымі, і таму мы змушаныя, таму мы папросту мусім хавацца ад страху і ўнікаць няўцямнасці з дапамогаю жменькі зацверджаных агульнапрынятых правілаў ды ісцін, каб аберагчыся ўсведамлення бессэнсоўнасці свайго собскага існавання, бо толькі самыя мужныя з нас маюць здольнасць, стоячы на краю магілы, нават ужо адною нагою знаходзячыся ў ёй, успрымаць усю паўнату і радасць кароткага імгнення, якое ёсць наша жыццё, толькі самыя мужныя з нас здольныя, усвядоміўшы фатальную непазбежнасць смерці, дзячыць жыццю за жыццё, можа быць, да гэтага здатныя яшчэ і вар'яты, хаця мужнасць і вар'яцтва падаюцца мне з'явамі калі і не аднаго парадку, дык безумоўна роднаснымі.

Пачатак Хаосу, на маё ўяўленне, палягае ў гуках, і калі гэта так, дык пачатак Космасу альбо Вялікага Парадку палягае ў Слове. Слова распачало Сусвет, і Слова будзе пры ягоным сконе. І Слова не можа быць ні большым, ні меншым, хаця часам мы спрабуем узяць на сябе няўздымнае бярэмя: намінатыўную функцыю. Мы імкнемся меркаваць, што калі мы назвалі рэч і калі далі ёй імя, то мы ўжо ведаем гэтую рэч, то мы ўжо, маўляў, пранікліў самую сутнасць рэчы. З аднаго боку, гэта ёсць радасная ў сваім наіўным энтузіязме думка, а з іншага боку, гук, што ўтварыўся ў выніку ўдыхання і выдыхання паветра, гук, за якім стаялі высілкі разуму, трапятанне нерваў, сардэчная болесць, гэткі гук якраз і можа стацца ісцінаю — Словам з правам першароднасці і вечнасці, той вечнасці, што адмерана таму, хто выдыхнуў у прастору гэтае слова.

Мы не прасіліся ў гэты свет, нас у яго запрасілі, а потым забыліся на нас сваімі міласцямі, мусіць, зыходзячы з меркавання, што галоўнаю міласцю для нас з'яўляецца самы факт жыцця, дарунак не заўсёды патрэбны і заўсёды выпадковы, а мы пры гэтым павінны да самага скону дзячыць і дзячыць за свой боль, за свой страх, за свае пакуты, за сваё трымценне і трапапятанне: лістота і трыснёг, трыснёг і лістота. Зялёны спачатку трыснёг, а потым зжаўцее, пасохне і ўпадзе. Зялёная спачатку лістота, а потым зжаўцее, пасохне і ўпадзе. І ніхто не ўспомніць, ніхто не пашкадуе, ніхто не ацэніць зацятага змагання на канцах галінаў, на самым акрайчыку глеістага берага. Люстэрка возера не захавае адбітку, вецер тут жа растрасе памяць пра тужлівае шалахценне. Бязлітасная смерць, але такое ж бязлітаснае і жыццё, і толькі глеба радасна-раўнадушна прыме да сябе тое, што калісьці аддала, і ў таемнай глыбіні Віроў, і ў чорных глыбінях нетраў зноў народзіцца жыццё, пакліканае Словам. І само гэтае слова яшчэ не мае формы і нясе на сабе ўсе радзімкі месцанароджання, але яно ўжо мкнецца выразіць сябе й інстынктыўна шукае таго, хто здольны несці на сабе ўвесь ягоны цяжар, а колькі не вытрымоўваюць і зломваюцца на самых першых кроках, але Яно ўпарта шукае самых моцных, самых здатных, самых трывалых, каб доўжыць сябе ў прасторы і часе. Слова — яшчэ дзіця, ягонае гучанне яшчэ цалкам пазбаўленае знешняга сэнсу, але ў ім ужо чутна моц, што бясстрашна супрацьстаіць распаду і затуханню. У ім яшчэ так шмат супольнага з Хаосам, але яно ўжо паказвае нам на сваю прыналежнасць да Космасу. Яно яшчэ стыхія, але яно ўжо ўсюды: і ўверсе, і ўнізе. Яно яшчэ не мае гармоніі, але яно ўжо гучыць ва ўнісон з нашымі сэрцамі. Яно ўжо сабрала ўсе інструменты ў адзіны аркестр, але ягоная гармонія нам яшчэ непадуладная. Яно жывое, яно дыхае, але мы няздатныя, так, мы яшчэ не гатовыя, каб назваць яго, каб прамовіць, а таму яно пакутуе ад жадання стаць Мовою. І хоць яно яшчэ безназоўнае, непрамоўнае, але яно ўжо абвяшчае пра нараджэнне новага свету, яно стаіць на парозе гэтага новага свету, яно настойліва грукаецца ў дзверы гэтага новага свету, яно самое з'яўляецца гэтым новым сусветам. Але яно ўсё яшчэ не можа адліцца ў канчатковую форму. І тут ёсць выкрыццё недахопу чалавечае мовы, тут ёсць неабходнасць мовы боскай...

Але згасае полымя, пакрысе стыне вуголле, мы зазіраем у ціглі і бачым, што замест золата і сталі, якія мы гартавалі ў домнах — толькі попел і прысак. А так усё гарэла, і ўсім было не тое, што цёпла, было горача і радасна, а зараз толькі горыч, такая, што нават палын — макавы мёд. Горыч ад таго, што не спраўдзіліся прароцтвы, што разбіліся ўшчэнт крышталёвыя надзеі, сутыкнуўшыся з адвечнай коснасцю матэрыі, што былі невыкарыстаныя магчымасці. І вось нібыта паўсюдна запанавала маўчанне. І зноў нібыта глухія сярод безгалосых, сляпыя сярод бязногіх. І гэта можа быць падставаю для адчаю. Але...

Але маўчанне, маўкліня не ёсць безгалоссем, бязгуччам. Гукі, галасы, яны — паўсюдна. Яшчэ чутнае вуха здольнае разбіраць гукі аркестра. Няхай яны затухаючыя, няхай яны — толькі рэха былой музыкі, але яны ўжо ёсць. І няхай яны не падстава для новай музыкі, але іхні ўзор можа быць уплецены ў новую тканіну, што ёсць распачатаю на кроснах часу. Безназоўнае, непрамоўленае, неназванае, невымоўленае не можа бясконца заставацца ў такім стане, яно будзе шукаць таго, хто здолее на сабе цягнуць бярэмя, і калі зломіцца нехта, дык узнікнуць новыя рукі і плечы, бо Слова хоча быць названым, Слова хоча называць, Слова хоча быць і доўжыць быццё, бы называючы рэч. Слова дае рэчы права на існенне. Там, у цёмных вірах, у цьмяных нетрах з агню, вады, паветра, глебы нараджаецца яно, марудна прапаўзаючы чарвяком сярод сырых каранёў, таемным шляхам каметы асвятляючы нерухомае сёння неба...

Музыка абкружае чалавека, і ён сам ёсць часткаю музыкі, і ён сам адпаведна боскаму дару здольны тварыць музыку. Вось толькі патрэбна адшукаць Слова, тое, што стаяла пры пачатку Сусвету, тое, што будзе пры ягоным сконе.

Спачатку яно шалясцела...

Пераможцы конкурса Бабарэкі

Журы конкурса крытыкаў імя Адама Бабарэкі абвесціла пераможцаў.



Адам Бабарэка (1899–1938) — беларускі пісьменнік і літаратуразнаўца, аўтар кнігі «Апавяданні» (1925), даследчык творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Дубоўкі, Кузьмы Чорнага і інш. Займаўся метадалагічнымі праблемамі літаратуразнаўства і гісторыяй беларускай літаратуры. Памёр у бальніцы Паўночнага чыгуначнага лагера НКУС.

Спіс пераможцаў конкурса выглядае так:

Міхал Бараноўскі
Марына Весялуха
Лілія Верхавенская і Аляксей Карамазаў
Маргарыта Дзяхцяр
Марыя Дуброўская
Андрэй Дудко
Аляксандра Лапіцкая
Яна Ліўшыц
Кацярына Рускевіч
Аляксей Чубат

Арганізатары конкурса (Беларускі ПЭН-цэнтр і сайт bookster, пры падтрымцы Саюза беларускіх пісьменнікаў) прынялі рашэнне не вызначаць пераможцаў у асобных намінацыях.

Пераможцы запрошаныя на семінар, прысвечаны пытанням літаратурнай крытыкі. Майстар-класы семінара будуць праходзіць на пачатку траўня ў Мінску, у праграме — сустрэчы з крытыкамі з Беларусі (Віктар Жыбуль, Ганна Кісліцына, Марыя Мартысевіч, Ціхан Чарнякевіч і інш.), Расіі (Даніла Давыдаў), Украіны (Юры Валадарскі), Чэхіі (Марцін Путна) і Швецыі (Інга-Ліна Ліндквіст), знаёмства з маладымі літаратарамі, паездка на радзіму Адама Бабарэкі. Таксама падчас семінара вырашыцца лёс галоўнага прыза конкурса крытыкаў імя Адама Бабарэкі — двухтыднёвага побыту ў Вільні ў межах праграмы «Рэзідэнцыя маладога літаратара».

Святы Вялікдзень



Зміцер ЗАХАРЭВІЧ

Зміцер Захарэвіч нарадзіўся ў 1980 годзе ў Мінску. Скончыў гістарычны факультэт БДУ. З 2002 да 2012-га праходзіў вайсковую службу ў органах пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь. Маёр запасу.

Друкаваўся ў «Нашай Ніве», «Літаратуры і мастацтве», «Белорусской военной газете» і ў «Новым Часе».

Загінулым у 1831-м і 1863–1864 гадах

Прымглёны туманом світанак.
Бывай, стары бацькоўскі дом!
У засень паркаў ды альтанак
Ці вернемся мы са шчытом?

І развітальны пацалунак
На ганку вусны апячэ.
Мной падагнаны ўжо рыштунак —
Мы вернемся не на шчыце!

За шаблі, штуцары і косы
Узяцца вымушае годнасць,
У бой ісці святы і жорсткі
За Нашую і Вашу Вольнасць!

Апоўначы атакай дзёрзкай
Прарваны карнікаў заслон —
Благаслаўвеннем у нябёсах
Штандар з Пагоняй і Арлом.

Не адыйсці нам у пасцелях
І на чужыне не змарнець —
Мы гінем пад агнём прыцэльным —
Альбо свабода, альбо смерць!

Жывыя кветкі на магілах,
Дзе спяць героі вечным сном,
Хай сведчаць Бацькаўшчыне мілай —
Вяртаемся мы са шчытом!

***

Сапраўдных хочацца радасцяў —
Тварыць, змагацца, кахаць,
Пакуль далёка разважлівасць старасці
І далакопы мае ў зыбках спяць.

Скрываўлены белы пялёстак
Па-над краем уладна ўзняць,
Каб жоўсцю зайшліся псякосткі
Праз нязданасць яго садраць.

Ад прыведзеных да карных шыбеніц
Прыняць удзячна слова-лязо,
Каб звінела сталь Мілавідская
У мінорах дый у басох.

Чуць, як Бацькаўшчыны нетры поўныя
Не стамляюцца нас сілкаваць,
Як крынічка праб'еца апоўначы,
Каб умець пра тое сказаць

Усім сляпым, дазвання зняверанаым,
Што фарсуюць бязроддзем сваім,
Каб у жэмчуг раскутага неба
Прагучаў пераможны гімн!

Вярнуўся сакавік

На двор вярнуўся сакавік
Сумётамі падталымі,
Загаласілі капяжы —
Зіма адгаспадарыла.

Не ведаючы таго сам,
Я развітаўся з ёю —
Не лічбамі ў календарах,
А зменаю настрою.

На чарках сябрукоў маіх
Іскрынкі прамянёвыя,
Мы за спачын п'ем першых крыг,
Услед бегчы гатовыя.

Наўкола нейк неўпрыкмет
Халодную напятасць
І футра скінулі з сябе
Без роздуму дзяўчаты.

Іх спробы кволыя яшчэ,
Ды хутка прыйдзе смеласць —
Якраз, каб даць нам зразумець,
Што час ісці на нераст.

Хоць не пазбыцца будзе ўжо
Шалёнай, хмельнай вольнасці
І не ўтрымацца ў абцугох
Дазволаў і прыстойнага.

Бо набрыняля зямля
Жывымі водамі адліг
Адчула (разам з ёю й я):
На двор вярнуўся сакавік.

***

Ад прысадаў, што смугою запарушаныя,
У раскутую вятрамі вышыню
Растрывожанай начною птушкаю,
Ледзь заўважны, мклівы шугану.

Пакідаючы правіны незамоленымі
І мітрэжных зданяў насланнё,
Воляй прагна дыхаю напоўніцу,
Між сузор'яў стаўшы на крыло...

Будзе час: надвор'е пераменіцца —
Кветны травень прыйдзе назаўжды.
Верагодна, мы яшчэ сустрэнемся,
Толькі ці пазнаю вас тады?

Бо на золку студзеньскім, запозненым,
Перароджаны, растану ў цішыні,
Развітаўшыся засветным позіркам
З тымі, хто застаўся на зямлі.

***

На сэрцы цемрадзь, золь, слата
І тое ж звонку,
Але на вуліцах гараць
Лятарняў гронкі.

І з ног збівае мінакоў
Бадзяга вецер.
Куды паклікалі яго?
Што ён намэціў?

Якія ўладныя ключы
Яму данесці
Тым, хто цяпер пакуль маўчыць,
Але ўваскрэсне?

Магчыма, гэтаю парой,
Дальбог, пагодна,
Скіруе, лёгшы на скрыдло,
Госцем найшчодрым.

Каму няўтульна на зямлі
У час капежны,
Каб зразумелі, што не ім
Жыццё належыць.

Каб адчувалі — ад нягод,
Як мае, прыйдзе
Праўдзівым лекарам штогод
Святы Вялікдзень.

І роспачна яшчэ зіма
Няхай нявечыць,
Ды тыя цемрадзь, золь, слата —
Яго прадцечы.

***

Дзе галлё бурштынавых хваінаў
Плыўка зыбае ў далонях небасхіл,
З рытму мернага збіваюцца гадзіны,
Компас не знаходзіць палюсы.

Нібы ўзяўшы чуйнасць у пазыку,
Я ступаю сцежкаю, якой
Скрозь стагоддзі насцярожана ласіха
З гадаванцам йдзе на вадапой.

Шнурам Арыядны павуцінне
Абвівае на зваротны шлях крысо.
Рву яго, застаючыся ў лабірынце
Валадарства станістых лясоў.

І, натхнёны пугачовым смехам,
Сіві Пан мяне дабраславіць,
Каб зрабіўся водгаласам рэха
У сакральным нерушы-жыцці.

І толькі нас заменіць час...



Альдонія НАЎЧАНКОВА

Ведаю Альдонію Наўчанкову па абласным клубе кампазітараў і паэтаў «Жывіца», які аб'ядноўвае творцаў Міншчыны. Мяне прывабіла асаблівая, цішмяна-прачулая інтанацыя яе вершаў. Не буду ўтойваць, што рыхтавала да друку аўтарскую кнігу паэткі «Дарогай спавітая доля» (2009 год).

Маладыя гады Альдоніі Міхайлаўны прайшлі ў Карэліі. Там яна набыла прафесію, стварыла сям'ю. Вярнулася ў Беларусь з сынам у 1979 годзе, жыла ў Клецку. Цяпер — у вёсцы сваіх бацькоў на Стаўбцоўшчыне, — Пільніцы, і яе асноўным клопатам стала не выданне вершаў, а падрыхтоўка да зімы. І калі лепшае з напісанага ў апошні час падасца вам не вельмі аптымістычным, то прыпомніце вёску свайго маленства — якой яна стала і які настрой выклікае...

Галіна Каржанеўская

Пільніца

Патрухнелі платы, пакасіліся хаты...
Адмірае у вёсцы жыццё
з кожным днём.
Час няспынна імчыць
нейкім злыднем праклятым.
Дзе збавенне? Дзе вечны наш дом?

Тут і людзі ад працы цяжкое — калекі.
Можа — год, можа — два,
можа, болей гадоў —
І адыдзе душа з гэтай вёскі навекі,
На сцяжынах жыцця
не пакіне слядоў.

У крыжовыя дні буду шчыра маліцца
На магілах, дзе продкі чакаюць ахвяр.
Ах, як лёгка ў жыцці памыліцца —
І як цяжка знайсці той ліхтар,

Што асвеціць дарогу
у вечнасць да Бога,
Дзе матулі заўсёды чакаюць дзяцей.
І туды ўжо не возьмеш з сабой анічога,
Толькі памяць жывых,
табе блізкіх людзей.

Дажывае свой век мая родная вёска,
І яе не кранае ніякі прагрэс.
Каля хаты ў сястры зелянее бярозка
І травой зарастае няходжаны лес.

Што пакіну ўнукам

Каб я была бярозкай —
Пакінула б лісты.
А каб была я рэчкай —
Пакінула б масты.
Аднак жа я істота
З Адамавай радні.
Мне за грахі — галота,
Чарнобыльскія дні.
Астылая пасцеля,
Халодная зіма...
Адна душа у целе,
Нічога больш няма.
Я сэрцам не астыну
І пасярод бяды.
Хіба любоў пакіну,
Якая назаўжды.

Сябру

І ты глядзіш на тыя зоркі,
На месяц той, што свеціць мне.
І лёс — такі ж палынна-горкі —
Не хваліш ты і не клянеш.

Хваліць — за што?
Канцы з канцамі
Звязці не проста. Прывыкай!
А праклінаць?
Рашайце самі,
Ці вам патрэбен гэты край.

Калі ж удача усміхнецца,
Тут і не ўспомніць мо пра нас.
Зямля пад небам застанецца,
І толькі нас заменіць час.

Дзень памяці

Пастаўлю свечку на акне —
Няхай гарыць.
Прыходзяць душы да мяне
Пагаварыць.
Ад свечкі свечку запалю —
Хай згіне цень.
Прыходзьце ўсе, каго люблю
У гэты дзень.
Дзень успамінаў і свята
Для ўсіх жывых.
Хай на зямлі не будзе зла.
Памянем іх.
У гэту ноч я бачу сны:
Яны прыйшлі
З маёй вясны і з той вайны,
Дзе паляглі...
На іх магілах, курганах
Расці траве.
Непратворанай у прах —
Душа жыве.

На мяжы

Вось і мяжа апошняя,
За ёю — небыццё.
Яшчэ трава не скошана,
Ды меншае жыццё.

З маланкамі і ліўнямі
Прайшлі мае гады.
І з воблакамі сінімі
Я паплыву туды,

Дзе маладосць шчаслівая
Распальвала кастры,
Дзяцінства мітуслівае
Кацілася з гары...

Туды, ў бары сасновыя,
Пакрытыя імжой.
Туды, дзе сны ружовыя,
Што разгаданы ўжо.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 4 (92) | 25 красавіка 2014 | № 16 (385) Новы час

Кабак



Андрэй ФЕДАРЭНКА

— Ты не Кабак, ты — мярзляк, — казаў камандзір аддзялення сяржант Тыжных свайму падначаленаму, радавому Кабаку. — Няўжо ў вас на радзіме так цёпла? Дзе ты жыў? На хутары? Што такое хутар? Хата? Што такое хата? Ізба? У лесе? Заімка? Ну вось, вырас у лесе, а мярзляк. Ніхто не мерзне — адзін ты.

— Чаму... адзін, — мармыча Кабак, хоць гэта праўда.

Усе навабранцы з іхняга ўзвода вучэбкі даўно асвойталіся, толькі ён, беларус з-пад Барысава, за тры месяцы службы — лістапад, снежань, студзень — ніяк не можа прывыкнуць да тутэйшай халадрыгі, да мясцовай прыволжскай зімы з яе вятрамі, снягамі, завеямі, калючымі рускімі маразамі, — той самай, што некалі ў гэтых вось палях дакапала армію Паўлюса. Кабак мерзне, як немец пад Сталінградам. Азяблы, скундзёблены, з уціснутай у плечы галавой — адно, што ад холаду, а другое, яшчэ са школы саромеецца свайго фізічнага недахопу — кадыка, ненатуральна вялікага, з вострым, як дзюба, храшчом. Асабліва храшч выпінаецца, калі трэба задзіраць галаву пры камандзе «смірна». Яшчэ на гэтым храшчы расце пучок валасоў.

— Ты не Кабак — ты вядзьмак, — казаў яму на гэта Тыжных.

— Чаму... вядзьмак...

— Валасы на кадыку толькі ў ведзьмакоў растуць. У ваўкалакаў, вампіраў... І прозвішча тваё чытаецца аднолькава ззаду наперад. У ведзьмакоў заўсёды так.

— Чаму... заўсёды, — па сваёй звычцы мармыча Кабак.

Ранішняе галенне — асаблівая пакута для яго. Цэлая рота набіваецца ў адзін пакой. Справа рукамыйнікі, злева пісуары, далей — туалетныя кабіны, усярэдзіне з высокімі «пастаментамі» і з кароткімі, спецыяльна падрэзанымі знізу дзверкамі, каб чалавек, што прысеў па патрэбе, быў відаць увесь. Умывальнікаў мала, да іх чарга, трэба стаяць, чакаць. Салдаты голыя да пояса, у адных белых споднiках з матузкамі і ў тапках на босую нагу. Холад ад кафельнай падлогі лёгка прабівае тонкія падэшвы, ногі ледзяныя.

Кабак асцярожна водзіць па храшчы лязом. Вада халодная, як ні старайся, а ўсё адно колькі валаскоў прапусціш, так яны потым і тырчаць цэлы дзень, хоць вышчыквай іх пазногцямі. Ён з зайздрасцю паглядвае на сібірака Тыжных, якому тутэйшыя марозы смешныя, на яго мускулісты торс, на тое, з якім спрытам ён голіцца: без люстэрка, навобмацак, у адной руцэ абмылачак, у другой — вастрэннае лязо. Некалькі спрактыкаваных рухаў: зверху ўніз, знізу ўверх, пад носам — толькі лёгкае пастрэкванне чуваць, і вось ужо чысценькі, гладкі, ружовы твар. Мабыць, калі б замест ляза далі яму шыла — пагаліўся б шылам. Усё займае ў яго некалькі хвілін.

— Дай, — прапаноўвае ён, бачачы, як Кабак выкручваецца целам, выварочвае руку, каб самаму сабе падбрыць ззаду. — Бо на цябе глядзець страшна, аж скура гусінай робіцца... Ну і шыя, — дзівіцца ён. — Тонкая, доўгая, як у гусака. А ў вас гусі ёсць?

Кабак асцярожна, каб не цапнула па карку, круціць галавой — няма, якія гусі; у іх ні возера, ні рэчкі, толькі канава з жоўтай тарфяной вадою.

— Нічога, — суцяшае яго Тыжных, абдзьмухваючы лязо. — Затое на вайне табе будзе добра.

— Чаму... добра...

— Ведзьмакоў куля не бярэ. Забіць цябе можна толькі сярэбранай куляю, — задуменна кажа ён. — У саменькі кадык. І абавязкова потым увагнаць у магілу асінавы кол...

Так ідуць дні, падобныя адзін на адзін, усе пад рэфрэн холаду. Стыла, холадна Кабаку паўсюль, нават у цёплых памяшканнях, такіх, як «ленпакой», ці вучэбныя класы, ці сталовая, не кажучы пра муштру на двары, заняткі на палігоне ці на пляцы ў час прыборкі снегу, якога кожную ноч навальвае столькі, што «Уралы» не паспяваюць вывозіць. Нават пасля адбою Кабак доўга варочаецца пад сваёй тоненькай коўдрай, падцягвае ногі да барады, лягае то на жывот, то на спіну, то грэе ногі рукамі. Раней яго койка была на ніжнім ярусе — ад падлогі знізу праз матрац дзьмула, памяняўся на верхнюю — ад вакна цягне... Жоўты месяц, поўны, вялізны, абыякава пазірае ў казарму, і ўсё роўна яму, што сон чалавечы такі кароткі, праляціць імгненна, і раніцай зноў тое ж: пад'ём, галенне-пастраенне, зарадка, сняданак, муштра, абед, прыборка снегу... Яшчэ адзін доўгі, халодны дзень!

Быў, праўда, кавалачак сутак, адразу пасля вячэры — законныя паўтары гадзіны вольнага часу, любімы, чаканы перыяд, калі Кабака крыху адпускала. Тады ён бег у «ленпакой» і прытуляўся да батарэі, як да грубкі. Іншыя бавілі кароткі адпачынак няхітрым чынам, ды і выбар быў небагаты: тэлевізар, шашкі-шахматы, напісаць пісьмо, падшыць каўнерык... Каб не губляць марна часу, выбіралі апошняе. Падшывалі каўнерыкі заходнія і ўсходнія ўкраінцы, два грузіны, тры каракалпакі, узбек з Ташкента... Ротны старшына разам з падначаленымі таксама ўвішна працаваў іголкаю. Худы, пацёрты жыццём, добры, стомлены, заўчасна сівелы ад алкаголю і няўдач на любоўным фронце — трэцяя жонка яго нядаўна кінула. Казахскі немец Андрэй Фішэр, рыжы, прышчаваты, як падлетак пераходнага ўзросту, расказваў пра змяю: «Ніколі ў жыцці такіх не бачыў: сама чорная, а галава вялікая, белая, круглая! Здалёк падумалі, гэта вялізны грыб-дажджавік. Падышлі бліжэй, а яна падняла галаву над травою, шыпіць, палохае!.. Мы хутчэй камення ў рукі... Ох, і ўцякала яна! Ох, і выкручвалася! Ратавалася так... Ды дзе там уцячэш — стэп кругом... Ох, і білі яе каменнямі па чым папала!..»

З тэлевізара маладая Ратару, ціснучы да грудзей рукі, горача, надрыўна заклікае:

— Приезжайте в Прикарпаття,
Приезжайте, люди добрі,
Завжди будуть раді вам!



Хлібом-сіллю вас зустрінуть,
Файну пісню заспівають,
В шану нашим світлим дням!..

Старшына бакавымі зубамі адкусвае нітку, адводзіць руку з гімнасцёркай, любуючыся сваёй працай і белатой падкаўнерыка. Нацягвае гімнасцёрку.

— Чаму білі так доўга? — пытае ён у Фішэра.

— А каб хвост перастаў круціцца...

— І! У синю даль! — ірве душу сабе і людзям украінская малдаванка. — По-над горами лине пісня ця! Про! Чудовий край!..

Украінец Стэпан, смугла-чарнявенькі, гарбаносы, з выпуклымі паўднёвымі вачамі, падобны на ліцэіста Пушкіна, калі таго падстрыгчы пад нуль і апрануць у форму СА, падпявае:

— Прыязджайце ў Закарпацця — там вас стрінуць кулямёты!..

— Усё так, — пацвярджае старшына, і не ў першы раз пачынае расказваць, як вёз навабранцаў, у Маскве патрапілі ў завіруху, цягнікі не ходзяць, двое сутак на Яраслаўскім вакзале, людна, цесна, прыбіральні не працуюць, скразнякі, паёк скончыўся...

— І вось ужо то там, то сям аратары, бунцікі, маўляў, за што ваявалі? Антысаветчына, — кажа старшына, — паўсюль, адкрытая, пагалоўная. Кожны другі антысаветчык. А цяпер уявіце, што не завіруха, а маленечкі эканамічны збой. Страх што пачнецца! Вайны не трэба...

Кабак грэе то рукі, то плячыма туліцца да батарэі. Вось так бы сядзець у адносным цяпле, адноснай утульнасці, слухаць старшыну і песню пра «чарівны край», марыць пра свой хутар, дзе і мароз не мароз, і снег цёплы, а каля грубкі адагрэўся б за 5 хвілін. Нехта тармусіць яго за плячо.

— На, — сяржант Тыжных працягнуў яму жоўтую круглую бляшаначку памерам з хакейную шайбу. — Гусіны тлушч. Сібірскі. Знарок для цябе заказаў, сёння пасылка прыйшла. Будзеш патрошку мазаць твар, рукі... Ды беражы, тонкім слоем, як вазелін, накладвай. Ніякі мароз не возьме. Бо з такімі тэмпамі ты да вясны не дацягнеш.

— Чаму... не дацягну, — замест «дзякую» мармыча Кабак. Ён круціць у руках, разглядвае бляшаначку...

— Зараз жа ідзі і змажся.

Кабак пайшоў да ложка. Адчыніў бляшаначку — поўная, тлушч густы, белы, і праўда, падобны на вазелін. Прыемна пахне дымком, дзічынаю, і яшчэ — свежым здорам. Кабак ашчадна, самым кончыкам пальца, намазаў лоб, шчокі, рукі, жывот, плечы, не паленаваўся скінуць боты — і ногі таксама намазаў. І раптам упершыню за тры месяцы ў ім нібы нешта пачало адтайваць, адлягаць. Нават як бы яму ўжо стала цяплей: ці то так імгненна падзейнічаў чароўны тлушч, ці проста ад чужой увагі, ад таго, што згадалі пра яго.

Тым часам: «Рота, строіцца!» — і зноў на вуліцу, на мароз і завіруху, памаршыраваць перад сном. Кабак кожную хвіліну прыслухоўваўся да сябе, да свайго цела, і з радасным здзіўленнем адчуваў — ну, не холадна больш. Не адчувае холаду! Ах, як гэта, аказваецца, здорава — не мерзнуць!

Потым, пасля вячэрняй паверкі-пераклічкі і адбою, ужо на койцы, ён таксама прыслухоўваўся да сябе. Месяц заглядваў у казарму. І Кабак усміхнуўся яму, як старому знаёмаму, і падміргнуў: маўляў, а мне ўжо не холадна! Круглая жоўтая бляшаначка ляжала пад падушкай. Кабак з падзякаю пагладзіў яе, адкрыў, не ўтрымаўся і лізнуў. Смачна!..

І вось расслабілася цела, саладка закружыла ў галаве, і паплыў, паплыў ложак у родны хутар... Сніцца Кабаку лес, зіма, снег, які, калі ўзяць яго ў пальцы, аказваецца цёплым гусіным мяккім пухам. Яшчэ сніцца бляшаначка, поўная бліскучых, як ртуць, прыгожых сярэбраных куляў. «Чаму кулі, калі там тлушч?» — праз дрымоту паспявае здзівіцца Кабак, а ўжо крычаць ашалелыя галасы:

— Першая рота, пад'ём!

— Другая рота — пад'ём!

— Баявая трывога!

Гупат ад саскоквання з верхніх ярусаў, заплечнікі, бразгат алюміневых кубкаў, біклажак, лыжак і спражак рамянёў, якія зашчэпвалі на хаду, каб хутчэй патрапіць у «зброевую», схапіць аўтамат, штык-нож, потым шынель з шапкай — і на двор. Толькі чуўся тупат ног па металічнай лесвіцы. Пляц хутка запаўняўся нявыспанымі людзьмі. Кабак апускаў вушы ў шапцы, калі яго штурхнулі ў спіну.

— Чый штык-нож?! — даўно крычыць старшына, падняўшы руку са штыком у чахле.

— Мой...

— Твой?! Я табе пакажу «твой»! Ты ў мяне да канца вучэбкі з кухні не вылезеш! Тры... пяць нарадаў!

— Чаму... пяць, — перапытвае Кабак замест таго, каб адказаць: «Ёсць пяць нарадаў».

Ноч. Зоры, якія то закрываюцца начнымі аблокамі, то зноў выплываюць, і над усім — вялікі, жоўты, як спелая рэпа, месяц. Салдаты ў шарэнзе хукаюць, прытупваюць нагамі. Вецер носіць снег і шэпат:

«У Афганістан...»

«Афганістан», — пачало перадавацца па шарэнзе.

«Вось там і пагрэемся...»

Кабак, як усе, перaступае нагамі, плячыма пацепвае, удыхае і выдыхае марозную пару. А сам усё прыслухоўваецца да сябе, да рук, ног, шчок... Халаднавата, канечне. Не май месяц. Зімна, сіверна. Але цярпіма! Не холадна! Зусім не тое, што было. Ні ў якае параўнанне! І лёгка яму ад гэтага, нават радасна на душы. «Нічога, — думае ён. — Можа, яшчэ і не заб'юць там, у Афганістане... Сярэбраных куль няма ж у іх...»

Зоры пакрысе бляклі. У тым баку, дзе горад, світалася. Вось-вось адтуль павінна было падняцца і брызнуць сляпуча-чырвонымі халоднымі промнямі сонца. Адбой прагучаў у сем раніцы, калі па шарэнгах замест «Афганістана» даўно гуляла іншае слова на «А»:

«Андропаў!»

«Андропаў!»

Генсек Андропаў памёр. У камандзіраў на тварах быў аднолькавы выраз: калі хочацца радавацца, а трэба паказваць засмучанасць, і ад таго ўсе яны былі добрыя, нават як бы ў нечым вінаватыя. У казарме старшына, натыкнуўшыся на Кабака, ні словам не згадаў ні пра злашчасны штык, ні пра нарады. Ад гэтага Кабаку яшчэ больш пацяплела.

Пасля сняданку быў прыемны сюрпрыз: замест муштры іх сабралі ў «ленпакоі», смуткаваць. Тыжных падышоў да Кабака.

— Ну вось! На салдата стаў падобны! Малайчына, герой. Памог тлушч? Што б ты рабіў без мяне, мярзляк? Прапаў бы!

— Чаму... прапаў бы, — па інэрцыі перапытвае Кабак.

— Ты ж глядзі, каб на халады хапіла. Расцягвай да канца зімы. Зразумеў?

Кабак ківае. Патаптаўшыся, пабачыўшы, што нікому не патрэбен, можна рабіць што хочаш, — ён выходзіць з «ленпакоя», ідзе да ложка, выцягвае з-пад падушкі бляшаначку, прысядае каля тумбачкі. Азірнуўшыся, дастае з кішэні дзве лусты чорнага хлеба, прыхопленыя ў сталоўцы, старанна намазвае адну скібку, зверху накрывае другой. Бляшаначку па-гаспадарску хавае назад. Затым, гледзячы ў радыёпрыёмнік на сцяне, няспешна пачынае есці. З радыёпрыёмніка гучыць урачыста-трагічны голас: «Весь советский народ, как и всё прогрессивное человечество, с глубоким прискорбием...» Кабак слухае, есць. Сківіцы яго марудна варушацца, ходзіць туды-сюды востры кадык з пучком валасоў на канцы, у прымружаных вачах — насалода.

2014 г.

Ход рэчаў



Феліks БАТОРЫН

Строма

Вецер здзімае пясчынкі
са стромы жвіровай.
Плынь вымывае пясчынкі
са стромы жвіровай.
Строма пад ветрам
і плынню мяняе абрысы,
Страчвае нешта
і штосьць адкрывае ў сабе.

Стромкія людзі
адкрытыя жорсткім стыхіям.
Вецер эпох з іх
штодня выдзімае цяплінкі,
Часу рака
падмывае іх плынню імклівай.
Падаюць стромы.
Балоты спакойна ляжаць.

* * *

Калі мігрэнь сціскае скронь,
А ў горле даўкі прысмак чаду,
Ты памакрэлую далонь
Падстаў з даверам лістападу.
Дарадзіць ён тваёй журбе,
Душы знямоглай дасць адкланне
І пакладзе ў руку табе
З адвечнай існінай пасланне.

Чырвоныя па залатым,
Сплятаюцца пражылкі ў словы.
Так проста ўсё ў пасланні тым,
Што зразумець ты ўжо гатовы…

Кніга

Чытаю кнігу я.
У ёй часы і лёсы,
І сённяшні заход,
і заўтрашні ўзыход,
І ўсіх зямных істот
жывое шматгалоссе,
Слязы гаючай соль
і пацалунку мёд.

Апошнім промнем дня
я закладу старонку
І вокладкаю том,
як векам, зачыню.
І адыду да сну.
І вінаграду гронку,
Нібы ліпнёвы дзень,
бурштынную прысню.

І буду чуць праз сон
я гук твайго дыхання.
А заваконны свет
напоўніць наш пакой
Баладай цвыркуноў
і голля калыханнем,
І плёскам цішыні,
народжаным ракой.

Каб нас не разбудзіць,
гаворачы на мігі,
Сузор'і паплывуць
у высі, як заўжды.
А раніцай ізноў
вярнуся я да кнігі
І выпушчу прамень,
закладзены туды.

* * *

Апошнія словы апошняй сустрэчы.
Наперадзе холад і змрок,
Чужыя абліччы і марныя рэчы,
Слязьмі затуманены зрок.

Злучаючы, доля плануе разлуку,
Рыхтуе, лагодзячы, боль.
Мы шчасце сваё спасцігаем
праз муку,
Як слодыч — праз горкую соль.

Паэт і кароль

Меў паэт пашану рэдкую —
Доля шчодраю была:
Сталаваўся ён аб'едкамі
З каралеўскага стала,
Карыстаўся ён абноскамі
З каралеўскіх ног і плеч,
А пісаў ён адгалоскамі
З Іх Вялікасцю сустрэч.

Ды хоць клікалі вялікасцю,
У нікчэмнасці манарх
Слынны быў дрымучай дзікасцю,
Голаў меў ён у штанах.
Як нашчадка вераломнага
Венцаносца яд забіў,
Каралёву дурасць помнілі,
А паэта свет забыў.

* * *

У багатай дыядэме галава,
Са смарагдамі каралі, бранзалеты…
Каб не бачыць пышна ўбраныя
шкілеты,
Не раскопвайце магілы харства.

* * *

Адпаўзаюць снягі пад навіслае
голле ялін.
Прабіваюць сатлелае лісце
зялёныя стрэлы.
Над ракою ад рання грымяць
крыгаломныя стрэлы,
І, клякочучы, ўспорвае неба
акрылены клін.

Так бывала ўсе вёсны.
Так будзе апошняй вясной.
Калі мецьму навекі
павекі стамлёныя змежыць,
Правязіце мяне непрасохлай
дарогай лясной
На сялянскім вазку, перш чым зробіце
ўсё, што належыць.

Гуны

Пах магільны, гул чыгунны,
Земляtрусны цяжкі крок…
«Вас адкуль прынесла, гуны?» —
«Мы тутэйшыя, браток!»

Натоўп

Натоўп — гэта тысяча адзінот
І тысяча неразуменняў,
Што мае адзін на ўсю тысячу рот
І цэлую крушню камення.

* * *

На поплаве па ранішняй траве
Распырсканая сонечная радасць,
А з малака, што па рацэ плыве,
Стрыжы разынкі зухавата крадуць.

…Разынкамі ў таплёным малацэ
Збівала мама кашаль мой
застудны.
Калі ж збягала кропля па шчацэ,
Яна казала: «Пырснула са студні…»

Чым больш я зазнаю
ў сваім жыцці,
Тым большая туга мая па маме.
Схацеў я студню маміну знайсці,
Але яна згубілася ў тумане.

Ход рэчаў

Калі ідзе смяротны бой
За шчасце, роўнасць
і братэрства,
Геройства плаціць галавой,
А трыумфуе крыважэрства.

* * *

Гуляе бэз, ні вока ані бока
Не гледзячы,
па травеньскіх садах.
Галёкае і блізка, і далёка
І ранішні, і вечаровы птах.

Раскоша ў свеце зухам і гарэзам,
Паблыталіся потым і спярша.
Спявае салаўём і пахне бэзам
Між красак ачмялелая душа.

Дзве святыні



Васіль ДЭБІШ

Гандляр

Базар. Зіма над горадам.
У твар завея б'е.
Гандляр, маленькі, згорблены,
Прысмакі прадае

Жабрак паблізу. Голадна.
Працягнута рука.
Глядзіць звысоку, з гонарам
Гандляр на жабрака.

Пагардліва адвернецца,
Не дасць ані граша…
Бы мёд, спакусу велічы
П'е сквапная душа.

Русалка

У змроку халодным нямотнага дна,
Туманным, дрымучым, глыбінным
Русалка жыла маладая адна.
Адна сярод пусткі і стыні.

Над ёю свяціліся зорак агні,
А вечар прасторы разгушкваў.
І сніліся ёй залацістыя сны:
Высокія дрэвы і птушкі.

Хацелася ёй цеплыні і святла,
Пяшчоты людской і кахання.
Рукамі ўзмахнула яна, паплыла
З цямрэчы ў блакітнае ранне.

– Загінеш, — раўла вадзяная сцяна —
Чакае там смерць, не пяшчота…
«Мне б сонейка ўбачыць, шаптала яна —
А потым — ці важна, што потым!»

* * *

У нудзе непрыглядный, адчаі
Захлынуўся б я — выжыць не змог
Без падтрымкі іх: аберагаюць
Дзве святыні — Радзіма і Бог.

Калі цемра кладзецца густая
На крыжы непазнаных дарог,
Шлях мой зорна тады асвятляюць
Дзве святыні — Радзіма і Бог.

Не сканацьаднаму ў паняверцы.
Нічым ні палон, ні астрог,
Бо навек пасяліліся ў сэрцы
Дзве святыні — Радзіма і Бог.

Звыроднасць

Кубло змеяў у купіне.
Пераплятаюцца,
шыпяць.
Ніяк не могуць
успомніць, хто яны?!.
Кубло змеяў у купіне.

Страх

Не бачыш нічога,
ды ўсё-ткі ідзі…
Чуеш,
у вецці зялёным
пагойдваецца птушка.
Недзе паблізу
звер прытаіўся.
Не бойся яго.
Гэты звер —
толькі ў нашых галовах.
Заўжды непрыкметнае тое,
што дзеліць святло і цемру.
Неспазнанае палохае нас
і страх нараджае.
Абрастаючы шкарлупіннем,
скажоным робіцца свет:
зоркі ноччу ярчэюць, растуць,
днём раптоўна знікаюць,



Фота В.Казакова

як мары людзей,
як нязбытныя мары Айчыны…
Ідзі.
Бачыш:
знаходзячы ў цемры дарогу,
не баючыся ўпасці,
месяц плыве…

Маланка

Мільгае маланка ў небе,
высвечвае сцежкі-дарожкі…
Ляціць праз ноч
проста ў маё сэрца.
Яна можа параніць,
забіць мяне.
Не хаваюся ад яе:
імклівая, жудасная,
ды вабіць да сябе,
не баіцца цемры.
Узіраюся ў неба.
Над Радзімай
гарыць прадкаў агмень.

Адрачэнне

Прысвячаецца
Васілю Гадульку

…Ён быў паэтам.
Ён пакінуў каханку
(век дакарала:
«Што піў?» і «Дзе грошы?),
вяскоўцаў (якія дапытваліся:
«Ці жывеш, ці памёр?..»).
Ён пакінуў свой дом,
які замінаў вольна дыхаць,
стаў служкай блакіту.
Ён пасвіў авечак, звяроў і птушак,
сляды на траве,
а ноччу — зоркі на небе.
Калі яму рабілася невыносна —
пачынаў лічыць
аблокі, васількі, час —
усё, што было вакол.
Ён ведаў мноства моў,
мог свабодна размаўляць
з кветкамі і птушкамі,
хмарамі і дрэвамі,
ветрам і ручаём.
Знудзіўшыся жыць, ён памёр;
пакінуў пасля сябе блакнот
з вершамі:
«Цяпер я, прынамсі, вольны —
ад сябе!»

Іранічнае

Я па БТ уключаю навіны.
Надта жахлівую бачу карціну:
Крызіс навокал, тайфуны, цунамі,
Мор у Пекіне, сутычкі ў Панаме.
Пухнуць ад голаду бедныя грэкі…
Скрозь парушэнне правоў чалавека.
А ў Беларусі цудоўнае ўсё
(Уравень жызні расцёт і расцёт)!
Гэтак праз год узрасце да нябёсаў.
Дзіўна, чаму ж я і голы, і босы?
Можа, я дурань, мо недарэка!?.
Дапамажыце мне, бедныя грэкі.

Песня



Віктар КАЗЬКО

Саспела. Хаця і сумнеўна, бо гэта не тое, пра што можна расказваць адрачона. Сэрца не хапае. А прайшло ж ужо куды больш за паўстагоддзе. Бунтуюць і адмаўляюцца не толькі сэрца — вочы, памяць: не і не. Але было, было…

Ускалыхнулася і абудзілася ўсё ўва мне некалькі гадоў таму. Але тады я не саўладаў з сабой, роспачна адмовіўся прызнаць і паверыць сабе. Бо гэта ўсё ж небяспечная справа — даваярацца былому, асабліва на схоне гадоў, як небяспечна хаваць у сабе недавер да таго, хто ці што нябачна і заўсёдна з табой і ў табе — да твайго абаронцы і абярэга: праўды, сумлення і яшчэ нечага, чаму няма і акрэсленасці. Мо свайго прывіда, здані. Нішто так не разбурае, не гнюсіць і не зводзіць нас, як немата і немач, нявыказанасць і недагаворанасць душы — яе акаліна і іржа. Да пары да часу стоеная і без таго ў нашым хісткім існаванні міна.

Міны свайго мінулага ды і сённяшняга трэба, неабходна размініраваць! Толькі ведаць, верыць і гаварыць.

Упершыню сфатаграфаванае маёй існасцю неасэнсаванага і напаўсляпога, а мо і цалкам сляпога дзяцінства я паспрабаваў выказаць у адказ на просьбу майго маскоўскага, не пазбаўленага да сівых гадоў настальгічна-сентыментальнай рамантыкі знаёмца. Наведаўшы канцэрт выбітнога спевака Дзмітрыя Хварастоўскага, паслухаўшы яго ваенныя песні, ён звярнуўся да мяне, каб я напісаў артыкул пра тое, якія песні спявалі мы, дзеці вайны, дзетдомаўцы, бо ў сталічных газетах распачаў дыскусію аб пустаце, нікчэмнасці і нават шкоднасці спеўнага рэпертуару сучасных эстрадных зорак. Рабіць гэта мне не вельмі хацелася. Час змагання з ветракамі даўно мінуў, сканаў. Не выжыў нават і хітрыкаваты вечны Санча Панса з падобным яму ж неўміручым аслом. Двух апошніх у свой час мне было асабліва шкада, бо ў іх мелася нешта ад нашага адвечнага балота, дрыгвы — палешука. Але адмовіць свайму маскоўскаму сябру я не мог. Так ужо заведзена ў нас, таго ж палешука бяруць заўсёды цёпленькім, не сілай, не нахабствам і пагрозай — ласкай, абавязкам, адвечным пачуццём у ім нейкай адказнасці, завінавачанасці ўсім і кожнаму, хто падыходзіць і звяртаецца да яго з паклонам. За паклон, за добрае слова мы заўжды гатовы хоць да чорта на рогі, у пекла. Больш за тое, гатовы да здрады сабе, сваёй хаце, сваёй будучыні, тады ўжо хай і трава не расце.

Я ўпарціўся, прагнуў збавення сваёй травы да таго ўжо часу забыцця. Але цалкам адмовіць у просьбе знаёмцы не здолеў, шмат у чым быў яму абавязаны, хаця б у шчырасці ягоных памкненняў. І таму адгукнуўся, пачаў пісаць. Але чамусьці адразу ж не заладзілася. На самой справе, якія песні былі ў нас, дзетдомаўцаў, адразу пасля вайны: «Вот умру я, умру, похоронят меня…»

Але і гэтага мы не спявалі. Наадварот, пазбягалі нават упамінання пра гэта.

Нібыта на непазбежнасць нашага лёсу была забарона. А мо хутчэй не існавала ведання саміх сябе. Як мне ўжо сёння здаецца, страх наступіць на міну, якую мы некалі абышлі, але на якой падарваліся на вачах у нас нашы бацькі. І страх іншы, не выказаны і глыбока прыхаваны, страх нашых бацькоў, ужо нябожчыкаў, а мо і ўсёй краіны: называць рэчы сваімі імёнамі. Няхай і падсвядома адмаўляць ці адвочнаму: не памінай ліха, і будзе ціха. Што таксама было мінай. Мінай замаруджанага дзеяння на дзесяцігоддзі і, пэўна, стагоддзі, на пакаленні. Дзеці, ці не ўсе, нават у маўчанні вельмі чуйныя на будучыню, прарокі і папярэднікі яе, асабліва пакрыўджаныя, абойдзеныя на дзяцінства. Дзяцінства краіны задушаных магчымасцяў.

Такім чынам, гэта было зусім не тое.

На ўсе часы, на ўсе эпохі дзяржаўнасці дзіцячай песні наканавана жыццялюбства. Нібыта дзеці ніколі не плачуць і не сумуюць, тым больш мы, казённыя, сталінскія дзеці. Але ж музычнасць неабдымная і ва ўзросце немаўляці. Яна ўжо закладзена ў калысцы, што бацькі падвесілі ў прыцемках печы і палацяў, працяг спрадвечнай уседжанасці катоў і котак з іх пяшчотай і замілаванасцю да жыцця. Толькі мы гэтага не зведалі, і таму нашы песні былі зусім іншыя.

Толькі што скончылася вайна, а мы, яе дзеці, працягвалі ваяваць. І чамусьці не ў апошняй Айчыннай, а ў грамадзянскай яшчэ вайне:

По долинам и по взгорьям
Шла дивизия вперед,
Чтобы с боем взять Приморье,
Белой армии оплот…

І гэтак далей, пра орденоносную, непобедимую и легендарную. Часам, праўда, не цураліся і не пазбытай намі ды нашымі бацькамі і недалёкай сучаснасці: «Артиллеристы, Сталин дал приказ…».

Пасля «приказа» перад словамі «зовет Отчизна нас» ішло ўжо наша, выпакутанае: «за наши парты и столы, за наши двойки и колы — огонь,огонь!».

Такія песні былі ў нас, калі мы хадзілі строем: у сталоўку, на памыўку, у лазню, у кіно. А хадзілі мы туды толькі строем, пад наглядам выхавацеляў і дырэктара дзетдома з завучам — былых пехацінцам і матросам-падводнікам. Спявалі шчыра, голасна, але не надаючы словам аніякай увагі, як вераб'і чырыкаюць пад стрэхамі хатаў і хлявоў ці ў пыле сярод вясковай вуліцы. Хаця, не без таго, падабаліся самі сабе: во, маўляў, мы якія.

Але ўсё гэта было ў гурце, не сказаць, каб пад вялікім прымусам, але, але… Самі ж па сабе песень не прaглі, хіба толькі іншым разам — каб пацвяліць дзяўчат: «Выйди на крылечко, милая овечка, я тебя подергаю за хвост…».

Спецыяльна варта адзначыць: усе нашы песні былі рускамоўныя. Ні слоўца па-беларуску. Хаця жылі ў беларускай вёсцы, у глыбі Палесся, у самым сэрцы былога Турава-Пінскага княства, і вучыліся ў беларускай школе. Насычаліся адметнай гаворкай тураўцоў, сакавітай, спеўнай, з працяглым «у-у-у» — «карпу-у-у», «маразу-у-у». Няма нічога на белым свеце, каб гэта было толькі часова і не памнажалася і не паўтаралася.

Вось такім, строевым і маршавым, да фабзайства і рамесніцтва было наша жыццё, абмежавана бачнае, у аблямцоўцы строгага раскладу дня. Але мелася яшчэ і нябачнае, патаеннае і сакрытае. Былі ў ім толькі наша музыка і песня — гармонія з водгукам і водарам вайны, эпохі беспрытульніцтва, нязбытага і жорсткага сіроцтва, безбацькоўшчыны. Адпаведна гэтаму — нячутна вуху нашых выхавацеляў вагонна, бяздарна мы спявалі: «По блату, по блату, спалили немцы хату, построили халупу, похожу на залупу…» І далей у такім жа духу: «По блату, по блату, дала сестричка брату, а братик дал сестричке потрогать за яички».

Вядома, дзе мы гэтага набраліся. Не толькі адно ад аднаго. Але і ад безлічы калек, бязногіх і бязрукіх інвалідаў — як іх тады называлі, нібы гавяду: туш, тушаў, недарэзкаў і недабіткаў вайны, што на нізенькіх калясках на шарыкападшыпніках акупавалі ці не ўсе намашчоныя, пылава-прысакавыя вуліцы невялікіх пазаштатных гарадкоў, мястэчак. А больш — чайныя і піўныя, як у свой паўнацэлы яшчэ час перадавыя і наступовыя пазіцыі і франты. У піўных і чайных, дзе пілі, канечна, зусім не піва і не чай, прымаючы ўжо мірныя сталінскія стограмоўкі, яны заканчвалі вайну, свой абсечаны, укарочаны век. Бо ім больш не было куды дзецца: якой хаце, якой жонцы патрэбна пушачнае мяса. І было іх у той час, калясачнікаў, думаю, не менш, чым сёння мэрсэдэсаў. Адпаведна яны і спявалі, стварылі сваю субкультуру: «На позицию девушка, а с позиции мать. На позицию девушка, а с позиции …»

Мы ж былі плоць ад плоці іх. Іх нашчадкамі з не менш горкім мінулым і, магчыма, будучым, хаця і не разумелі гэтага. І ў нашым малпаванні не было ні іх горычы, ні пратэсту. Хаця сёння, мне здаецца, гэта і спрэчна. Пратэст, бунт — увогуле вельмі спрэчныя рэчы і не заўсёды вытлумачальныя –патаемныя. Падобны на паслячарнобыльскія лясныя пажары: ніхто па барах не хадзіў, сцерaглі іх і вайскоўцы, і пажарнікі, і леснікі. А лясы гарэлі. Гарэлі бары, дубровы і гаі, памнажаючы дымам і пáламі радыяцыю. Вось і мы па-беларуску ціха тлелі гарэзнасцю дзяцінства. Спеўна, фальклорна і лагерна тлелі, не ўсведамляючы, якая нячыстая сіла водзіць і кіруе намі, пакуль наш радзіміцкі, крывіцкі ці дрыгавіцкі Бог спіць ці плача. Нездарма ж кажуць: у ціхім балоце ўсе чэрці водзяцца…


Вось прыкладна тое, што я напісаў свайму знаёмцу ў адказ на яго зварот да мяне. Мо крыху з'едліва і нават злосна. Не мог напісаць інакш — усю праўду, недзе толькі частку яе. Бо праўду пісаць было горка, і была яна мне вельмі балючай, апякальнай. Гэты свой праўдзівы допіс я адасылаў адрасату. Па настроі і ладзе ён не падышоў ні яму, ні газеце. Не было ў ім, як я сёння разумею, ні настальгічных сантыментаў, ні замілаваных усхліпаў па мінулым. А горыч і боль прарываліся нават паміма маёй волі.

Хаця ў нашым былым казённым жыцці мелася і іншае. Жыццё не бывае аднакаляровым і толькі змрочным. Было яно звычайным, як гэта заведзена — ад чалавека да чалавека. Таму сёння мяне і раздражняюць не толькі ўхваленні нашага светлага мінулага, але і праклінацці яго: нявартa на люстэрка злаваць, калі рожа крывая. Хто быў крывы, той ім і застаўся. Як гаворыцца, гарбатага толькі магіла выправіць. А наша беларуская доля адна, нязменная на ўсе эпохі і стагоддзі. Доля чалавека, які жыў, жыве і будзе жыць. І была ў ёй песня, бо мы ўсё ж не сугнеі. І, галоўнае, выжылі. Нема мыкалі, нема стагналі і плакалі, але захаваліся. Нехта ці нешта нас выцягнула з забыцця на паказ і пагляд часу. І ці не спевам, ці не песняй было наша абвяшчэнне свету сябе — наш першы крык, стогн і енк з заплюшчанымі яшчэ вачыма — пачатку ўзыходу на нашу галгофу, пакутнага, але і радаснага з'яўлення ў зямной юдолі.

Хораша спявалі нашы дзетдомаўскія дзяўчаты. Гэта ў іх абудзілася неяк вельмі нечакана — для нас, падлеткаў, хлапчукоў. Мо нечакана і для іх. Толькі ледзь-ледзь нешта праблiснула напераздзе, пасвятлеў дзень. Дзяўчаты пачалі апранацца не ў аднастайна шэрае, рудое і чорнае, старэчае, а ў дзявочае. Белыя кашулькі, каляровыя — васільковыя і рамонкавыя — спаднічкі ды сарамліва накінулі замест чырвоных гальштукаў зноў жа каляровыя касынкі, як у іх прарэзаўся голас, нібы гаманлівы ручаёк з-пад мінулагодняга снегу.

Мы былі настолькі агаломшаны, што спачатку і не пачулі іх голасу, іх спеваў, як вясковыя людзі з надыходам вясны не заўсёды чуюць першую песню жаваронка над скаванымі яшчэ халадамі лесам і полем, таму што зрокам і слыхам ужо скіраваныя на будучае: вываз гною, узорванне нівы. Сяўбу. А птушыная песня ў іх у душы. Бо яна і ёсць іх душа.

І мы, упэўнены, спачатку пачулі не словы, не спеўныя галасы нашых дзяўчат, а нешта большае, што не выгаворваецца і не перадаецца ўслых, галасамі і словам. Ці не душу іх, што прагла песні. І ці не сваю душу адчулі, яшчэ кволае яе шавяленне ў кайданах, латах і кіпцюрах нашага мінулага. І праз гэта, як не дзіўна пра гэта сёння гаварыць, адчулі прагу дзейнасці, у нашых умовах, прагу азірацца навокал сябе і нешта рабіць. А найбольш тое, што было звыкла для нашых



бацькоў, у пераважнай большасці сялянаў.

Было гэта само сабой не асэнсавана падсвядома, іншым разам, і часцей за ўсё, нават прымусова. Але было, было, і прымус гэты ці не быў салодкі. Бо побач з намі займаліся той жа працай і нашы дзяўчаты. Садзілі бульбу і гародніну, садзілі дрэвы — свой дзетдомаўскі сад, кукурузу-кіяхі. І палолі іх, не толькі сваё, але і калгаснае.

Выязджалі на палеткі на франтавой дзетдомаўскай лайбе-палундры — палутарцы, падараванай нам вайскоўцамі. Дзяўчаты ехалі на працу, як на свята, у лепшых сваіх уборах, чысценькія і звонкія, таксама як і ў дзетдоме няспынна па дарозе спявалі, чыста, звонка і ненадакучліва, у нейкім родзе не заўсёды нават словамі, нячутна і нябачна, як прыродным і прыродным вясковым дзецям цвітуць палявыя кветкі, як кувае на першы зялёны ліст пад зноў жа першай травеньскай навальніцай абуджаная птушыным граем, яго руплівасцю і жаданнем свайго і чужога кубла зязюля.

Толькі песні нашых дзяўчат чамусьці былі сумнымі. Мо ў іх таксама было нейкае прадчуванне. Не ў прыклад нашым бадзёрым, баявым і блазнаватым — надта сумныя і зусім не наскія:

Скакал казак через долину,
через кавказские поля,
Скакал он, всадник одинокий,
блестит колечко на руке.
Кольцо казачка подарила, как
уходил казак в поход.
Она дарила, говорила: «Твоя я
буду через год».
Вот год прошел, казак стрелою
в село родное поскакал...

Вядома, не абыходзілася без распаўсюджанай на той час «Катюши» — своеасаблівага дзявочага гімна. Але тут ужо не ўтрымліваліся і мы, гарэзліва зацягваліназнарок і напераховп: «Расцветали веники в парилке, поплыли туманы по реке, выходили на берег ботинки на высоком дамском каблуке...»

Дзявочую песню мы забівалі дзікасцю, весялосцю дарогі, прастораў неба і сонца, што заманьвалі і ўгравалі нас. Але дзяўчаты, як нічога не чулі, як нічога не чуе салавей пад час сваёй песні кахання. На хвіліну-другую толькі па-змоўніцку замаўкалі — і пачыналі зноў спяваць. Падштурхоўвала і правакавала іх самая маленькая і непагляданая. Аня Лягун, жабянё, у якога, апроч вачэй і вялікага роту, нічога яшчэ дзявочага ці жаночага і не было. Толькі сум, сум, глыбока стоены недзе ў яе птушыных, заўсёды здзіўлена выразных і запытальных вачах. І спявала яна — як некаму малілася, невядома за што прасіла ў некага прабачэння. І дзякавала, дзякавала таксама невядома каму, недасягальнаму нікому з нас, з будучага ці мінулага:

Дан приказ ему на запад,
Ей в другую сторону,
Уходили комсомольцы
На гражданскую войну...

Цяпер маўчалі мы. Песня была відавочна не наша, але яна зачароўвала нас, бо мы былі ці мусілі ў хуткім часе быць камсамольцамі. І ў нашай крыві жыла вайна, параджэннем якой мы самі былі і да якой, няхай падсвядома, рыхтаваліся сёння ці заўтра і загадзя вызначалі ў ёй сваю долю. Долю новых Матросавых, Гастэлаў — герояў, зразумела. І гэта ўжо нас аплаквалі дзявочыя галасы, галасок нашай салоўкі Ані Лягун.

Між тым чуткі пра дзетдомаўскіх галасістых дзяўчат пайшлі па ўсім наваколлі. Іх пачалі запрашаць у раённы і вясковыя клубы. Ездзілі з натхненнем і радасцю. Да ўсяго дзетдом атрымаў замест сваёй франтавой лайбы-палундры новую машыну. Толькі з заводу, з невыветраным яшчэ пахам фарбы газік. Не ведалі няшчасця, ды шчасце дапамагло.

У чарговую паездку на канцэрт напакавалася столькі дзетдомаўцаў, што аж барты трашчалі — каму трэба і не трэба. Ехалі, зразумела, з вецярком і з песнямі. Мо таму і не пачулі, як адваліўся задні борт. Чаму такое адбылося — ці то нехта недакруціў нейкую гайку, паставіў надламаны борт, спрахнелыя дошкі. Толькі дзетдомаўкі пасыпаліся на машчоную чырвоным булыжнікам, з'езджаную да мазалёў і бляску крыві дарогу, як гарох. Падалі з даволі высокага кузава на плякаты крывавы камень.... Сыпаліся на жорсткі дол і мкнулі зноў у кузаў. Як здавалася ім, выратавальнае кубло.


Задняя падалі, а пярэднія, яшчэ не цямячы, што адбываецца, чаму ім вальней і прасторней стаяць, працягвалі спяваць патрыятычную песню, не здагадваючыся, што гэта ўжо рэквіем:

Уходили, расставаясь,
Покидая тихий край:
«Ты мне что-нибудь, родная,
На прощанье пожелай».
И родная отвечала:
«Я желаю всей душой,
Если смерти, то мгновенной,
Если раны — небольшой».

Смерць большасці са спявачак была імгненнай. Толькі Аня Лягун пакутавала доўга, такая ў ёй была прага жыцця. Яна ўчапілася з аднаго канца за не зусім адарваны борт машыны і цягнулася за ім да схону. І да схону гучала з машыны песня. А машына працягвала бегчы наперад. А за ёю каменна і крывава доўжыўся, як выдзерты з пашчы хіжага звера, чырвоны язык. У вышыні саспелага ўжо дня гучала песня. Унізе — паядала яе дарога. Дарога бязлітасна і бяссэнсава пажырала сваіх дзяцей, пазбаўляла сама сябе іх голасу і мовы, якой яны тады яшчэ нават і не набылі...

Не думаю, што тут трэба некаму хоць што-небудзь тлумачыць. Не магу і няздольны. Мае словы скамянелі яшчэ больш за паўстагоддзя таму, калі каменна была размазана крывёю паміж небам і зямлёй наша дзетдомаўская падлеткавая песня. Таму я столькі часу і маўчаў, і таму не атрымалася ў мяне допісу ні свайму маскоўскаму знаёмцу, ні ў маскоўскую газету. Нават на настальгію Хварастоўскаму, на яго выдатны голас і не менш выдатныя песні нічога не маю сказаць.

Труба



Лявон ВАЛАСЮК

З крана на кухні нудна капала вада. Яе гукі былі падобныя на ўдары малатка па галаве...

Цётка Паліна пакутліва глядзела на брудна-іржавыя кроплі і думала пра тое, як хаця б перад смерцю папіць чыстай вады.

Калодзеж у двары быў, але ж калі пусцілі ваду па трубах, дык суседзі амаль перасталі ім карыстацца, і вада застойвалася, карыстацца ёю можна было хіба што для паліву градак. Але ўсё ж бывалі часы, калі рамантаваліся вадаправодныя трубы і суседзі выбіралі ваду з калодзежа да жоўтага пясочка. Такім момантам карысталіся, каб і пагаварыць, як некалі, каля калодзежа. Калі тое было?..

Цётку Паліну даўно ўжо цяжкая хвароба моцна трымала за рэбры, ды, нягледзячы на тое, жанчына вымушана была рухацца, бо муж яе, Зміцер, увогуле не меў сілаў падняцца з канапы. Жанчына найперш думала пра мужа, з якім пражылі ўжо больш за паўвеку, вырасцілі дваіх дзетак. Зося, старэйшая, і сын Васіль нябляга ўладкаваліся ў жыцці, хаця ліха хапіла.

І вось цяпер гэтая іржавая вада з крана. Яе стук па эмалі ракавіны па кроплі выбівае з хворай жанчыны апошняе здароўе...

У «маладой» пенсіянеркі Зосі і яе брата Васіля памерла маці Паліна: не верылася, што яшчэ жвавая, рухавая жанчына можа так рана сыйсці ў лепшы свет, хоць і было ёй на той час амаль восемдзесят гадоў. Даканала невылечная хвароба, што нечакана прыстала да яе і ўжо не адчапілася. Застаўся ў хаце ляжаць бездапаможны Зміцер, які апошнім часам і размаўляць ужо не мог. Пакуль бацьку даглядала маці, то нібыта ўсё было ў парадку, а цяпер...

Зося з мужам Аляксандрам пераехала ў бацькоўскую кватэру, калі ўжо не стала маці. Брат Васіль жыў у сталіцы, займаў высокую пасаду. Ён часцяком прыязджаў да старых, калі знаходзіўся па справах у вобласці. Ды і Васілёвы дзеці пакуль заставаліся ў родным горадзе: у кожнага была свая сям'я, свая праца...

Тая невялічкая бацькоўская кватэра знаходзілася ў старым «чыгуначным» цагляным аднапавярховым доме. За гародам са сціплаю лазняй пралегла чыгунка, адкуль заўсёды ішоў спецыфічны пах, асабліва летам, калі сонца добра награвала шпалы і рэйкі. Абапал палатна былі глыбокія равы, якія з вясны напаўняліся вадою — і адтуль чуліся вясёлыя галасы птушак і жабак...

Да кватэры гадоў дзесяць таму сын Васіль зрабіў прыбудову, у якой знайшлося месца ўсім неабходным для бацькоў выгодам: з'явілася вада, каналізацыя, прыродны газ. Але праблемы ўсё роўна заставаліся.

Праблемай была і вада, падобная па колеры на гарбату трохдзённай выпрымкі. Менавіта з гэтага і пачаліся ў Зосі клопаты і прыгоды ў бацькоўскай кватэры.

Найперш яна пайшла ў чыгуначны «Водаканал». Маладая жанчына-інжынер, да якой звярнулася наведвальніца, адказала, што яны да той вады не маюць ніякага дачынення:

— Мы падпарадкоўваемся зусім іншым структурам, а вашыя праблемы трэба вырашаць з новым начальствам. Прыходзьце зранку, сустракайцеся і вырашайце...

За тыдзень Зося так і не змагла сустрэцца з начальнікам арганізацыі ў непрыкметным будынку за высокай бетоннай агароджай...

Махнуўшы рукой на тое ведамства, Зося вырашыла ісці да кіраўніцтва абласной чыгункі, дзе раней працавалі бацькі. Тут яна нарэшце трапіла да галоўнага інжынера, які ветліва сустрэў Зосю і запрасіў прысесці...

— Мае бацькі ўсё сваё працоўнае жыццё аддалі чыгунцы, — сказала жанчына. — Дзякуй за кватэру, у якой мы жылі, пажаніліся. Але цяпер іншы час — XXI стагоддзе. Таму ад вас патрэбна толькі адна дапамога: вырашыць праблему з іржавую вадою ў іржавай трубе...

— Усё, што ад нас спатрэбіцца, зробім, — запэўніў інжынер. — Вы не хвалюйцеся толькі. Але на ўсялякі выпадак схадзіце і да галоўнага інжынера вашай ЖКГ. Я пазваню яму: мы аб'яднаем нашыя намаганні.

На тым і разышліся. Галоўны інжынер чыгункі абяцаў дамагчы з праблемай да зімы. Развітаўся за руку, што вельмі здзівіла і абнадзеіла Зосю.

Пасля шматлікіх званкоў і паходаў па кабінетах да Зосі прыехалі рабочыя. Яны прадзімалі трубы, нешта раскручвалі і закручвалі, ды толькі вада ад гэтага не стала чыстай... Так працягвалася доўгія дні і тыдні.

Непрыкметна надышла чарговая восень. Калі-нікалі пачыналі лётаць і белыя мухі. Двое мужчын капалі траншэі ля плота Зосінага суседа: шукалі трубу, што давала ў кватэру «фарбаваную» ваду. Зося нават гатавала для «сваіх» работнікаў гарбату, каб грэліся гарачым у холад: шкадавала мужыкоў.

Неяк у размове адзін з рабацяг, які назваўся Міхасём, па-сакрэце паведаміў, што яны ведаюць, дзе тая труба: даўно яе намацалі, але толькі іх галоўны інжынер даў загад «пратрымацца» ў траншэі да маразоў...

...Зранку, якраз у пятніцу, Зося пазваніла ў сталіцу брату Васілю, паведаміла пра хамства і ашуканства галоўнага інжынера мясцовай ЖКГ.

У панядзелак, яшчэ не развіднела, ля дома сабралася агромністая грамада тэхнікі і людзей. Усе мітусіліся, нешта спрабавалі рабіць, шмат крычалі і мацюкаліся.

На наступны дзень раскапалі шырокую вуліцу-дарогу. Пачалі класці новую трубу.

У абед прыехаў Зосін брат Васіль, які па дзяржаўных справах якраз апынуўся ў родным горадзе.

— Як ідуць справы? — спытаў з сур'ёзным выглядам толькі ў сястры.

— Тваё слова зрабіла сваё, — усміхнулася Зося.

...Ваду падвялі нанова да ўсіх кватэр у доме. Ды толькі галоўны інжынер ЖКГ Віталь Іванавіч, лысаваты мужчына няпэўнага ўзросту, вырашыў усё роўна пад канец напаскудзіць жанчыне, праз якую меў непрыемнасці. Трубу з яе санвузла кінулі недавезенай да галоўнага калектара. Такі быў загад галоўнага інжынера.

Калі на наступны дзень ён прыехаў паглядзець на вынік сваёй працы, Зося выйшла на падворак, дзе яшчэ не была засыпаная траншэя, каб выказаць гэтаму непрыемнаму для яе чалавеку ўсё, што пра яго думае. Здарылася так, што ратуючыся ад колкага слова жанчыны, Віталь Іванавіч аступіўся і зваліўся нечакана ў незасыпаную траншэю.

— Вось бл...а! — толькі і паспеў крыкнуць, апынуўшыся ў пастцы, у якой і павярухнуцца не было як яго агрузламу целу.

— Труба табе тут будзе, інжынер савецкі! — злосна крыкнула Зося. — І ўсёй тваёй старой сістэме! Не вылезеш адсюль, пакуль не дазволю! Закапаю, і ніякая «Белая Русь» табе не дапаможа! Колькі ты маёй крыві папіў?!. — Жанчына схапіла рыдлёўку, што знаходзілася сіратліва ля сцяны прыбудовы, стала на краі траншэі, гатовая кідаць туды зямлю... Твар галоўнага інжынера перакасіла ад страху і сораму. Мужчына як анямеў: не магу адказ нават нешта вымавіць гаспадыні двара.

Рабочыя, як нічога не здарылася, ціха разышліся, пасміхаючыся ў ватоўкі.

З крана на кухні нудна капала вада. Для Зосі пачаўся новы адлік часу, толькі вось сівых валасоў дабавілася на скронях заклапочанай жанчыны і тонкіх стрэлак ля вачэй...



Бабскі бунт

«Прайшоўшы праз неймаверны колазварот людзей і падзей, стаўся годным на шостым дзясятку гадоў пахуліганіць у літаратуры, — адзначыў пра сябе аўтар. — Лепшым пісьменнікам было, ёсць і будзе само жыццё. Глядзець на дзікасць і дзіўнасць рэальнага свету стараюся пад нечаканым ракурсам, вачыма, у якіх скачуць чорцікі. Хачу, каб мая проза была падобнай да жыцця, а жыццё, нават у самых неверагодных праявах, было падобным да таго, што змагу напісаць».

Прапануем увазе чытачоў апавяданне з другой кнігі пісьменніка-сатырыка «Варажбітка», якая ў хуткім часе выйдзе ў выдавецтве «Логвінаў». Кніга працягвае аўтарскую серыю «Легенды гарадскіх ускраін», першую з якой — «Глухмень» — яшчэ можна набыць у кнігарні «Ў».

Віктар АСІПЕНКА



Вечар выдаўся празрысты і ціхі. Працоўны дзень каціўся да свайго афігею. Начальнік Казляеўскага райаддзела міліцыі маёр Палажняк Ігнат Васільевіч смарканўў пад стол і вывеў на аркушы паперы: «Акт пра патананне». Пасля закрэсліў і напісаў: «Акт пра ўтапленне».

— Суха. Не бачны размах праведзенай працы. А калі напісаць: «Акт пра ўваход цела ў ваду і нявыхад яго з вады»? Не, так увогуле падобна на задачу са школьнага падручніка. Пісака! Ваўчыную хватку опера забівае ўва мне канцыляршчына!

Маёр наліў з мельхіёравага чайніка паўшклянкі выратавальнага чыфіру. Як некалі, у маладыя гады, яму захацелася, сціскаючы песцік у руцэ, паганяць урак, пашчоўкаць сталёвымі бранзалетамі на запясцях у бандзюганаў. Нуднае сядзенне ў райаддзеле прызнавалася карысным толькі ў дні бязвоблачнага пекла, калі любое жывое стварэнне шукае выратавальны цянёк.

Хтосьці з павагай пастукаў у дзверы. Твар Палажняка прыняў заклапочана-дзелавы выраз. Увайшоў старшы лейтэнант Канарэйкін. Выглядаў старлей горш за тапельца.

— ЧП, таварыш маёр! Бунт! Затрымана паўтара дзясятка чалавек.

Бровы Палажняка сурова сышліся на пераноссі.

— Завадатараў у казамат! Дапытаць як след! Выпісаць кожнай істоце па мордзе! Калі пытанні застануцца без адказаў — па нырках! Кру-гом! Аб выкананні далажыць!

— Якія ныркі, таварыш маёр, бабы бунтуюць!

— Якога хрэна бабам трэба?!

— Чорт іх ведае! На ўгаворы растлумачыць сутнасць свайго бунту не паддаюцца. Начальніка патрабуюць!

— Якія ўгаворы?! Яны, што, на пляжы ў шэзлонгах ляжаць, а ты разносчык халоднага піва?! Галава ў цябе нашто?

— Ем галавою!

— Думаць галавою трэба, а карміць па заслугах.

— Так точна! — і Канарэйкін ліха шчоўкнуў абцасамі.

— Пайшлі. Пакажаш бунтарак.

Палажняка ў райаддзеле паважліва звалі «рэнтген». Калі маёр неміргаючым позіркам дзіравіў злачынцу, прамаўляючы легендарнае: «Я цябе, падла, наскрозь бачу», нікому не ўдавалася адмаўчацца.

У цеснай дзяжурцы дванаццаць жанчын ціха аб нечым шапталіся. Хутчэй за ўсё, аб сваім бабскім гаротным лёсе. Крыху ўбаку моўчкі сядзелі трое мужчын з каменнымі тварамі. Каларытная цётка ў вясёленькай кофтачцы дзелавіта грызла яблык.

«Каларыцішча, зараза!» — без злосці падумаў маёр і ўпіўся славутым пільным позіркам у шустранькую з выгляду жанчынку. Жанчына здрыганулася і ледзь не папярхнулася кавалкам яблыка.

— Вы мяне вачыма так не страшце! Па вашай міласці ледзьве яблыкам не падавілася.

— Кофтачка на вас пухнатая, — знайшоў што адказаць Палажняк. — Вачэй не адарваць.

— Сапраўдная шэрсць егіпцянскіх вярблюдаў.

— Тое, што шэрсць вярблюджая, я адразу зразумеў па двух горбіках на вашых грудзях.

— Рэнтген! — падумаў з павагай Канарэйкін і зашаптаў шэфу на вуха. — У пратаколе адзначаны факт групавога парушэння грамадскага парадку. Жанчыны на плошчы, нецэнзурна выражаючыся, замінаалі людзям культурна адпачываць. Завадатар — Муратава Вольга Пятроўна, тая, што з яблыкам. Дваццаці васьмі гадоў, швачка. Па словах відавочцаў, так крыла матам, што заслухацца можна. Хвацкую лаянку выдавала! Крыніца натхнення пакуль не выяўлена.

— З дазнаннем валаводзіш, старлей! — нахмурыўся Палажняк і пераключыўся на аматарку яблыкаў і моцнага слова. — Давай, Вольга Пятроўна, выкладвай, як табе собіла ў хуліганкі запісацца! Бач ты, надумала мацюкамі крыць у грамадскім месцы! Табе што, кутоў у кватэры бракуе?! Уткніся носам у кут і мацюкайся колькі заўгодна — пазбаўляйся нечысці.

Муратава паклала абгрызак яблыка ў пакецік, выцерла далонёй сакавітыя вусны і залапатала:

— Грамадзянін начальнік, на плошчы праходзіў марш пратэсту непрыгожых жанчын супраць усталяванага мэрыяй сухога закону пад час святкавання «Дня горада». Матывацыя пратэсту змяшчацца ў некалькіх словах: «Непрыгожая баба цвярозаму мужыку па абуху».

— Пачакай, пачакай! Твае словы з партрэтам твайго твару не стыкуюцца. З твару ты сімпатычная, ды і фігурай не пакрыўджана. Не магу зразумець, як ты патрапіла ў кампанію непадобных да сябе?

— Каб мяне зразумець, вялікага розуму не трэба. Душа бунтуе, бо стамілася чакаць нармальнага мужыка. Маньяк і той бесхрыбетны пайшоў! Згвалтаваць толкам не можа. Уздумала неяк бесхрыбетнае чмо абразіць мяне апоўначы на паркавай алеі. Плашч на сабе расхінула, а там замест мужчынскай годнасці нейкая ерунда лядашчая вісіць. Без бінокля цяжка разгледзець. «Што ж ты, паразіт, з пузам кавуновым да мяне сунешся! — накінулася на маньяка. — Хвосцік твайго кавуна дзе?! Усох хвосцік?!» Так напалохала маньячыну, што пракляты драпака даў, ажно толькі пяткі блішчэлі ў месяцовым святле. Чахарда ў мяне з мужыкамі пачалася, як ярмо замужжа на сябе павесіла. Але пакуль сілы ёсць і на здароўе не скарджуся, хачу жыць паўнавартасным жыццём, каб потым не праклінаць сябе за дарма пражытыя гады. «Конь» майго мужыка скача заўзята толькі час ад часу. Шукаю мужыка з правільным «канём». Кожная жанчына хоча аднаго…

— Потым другога! — не стрымаўся маёр, якому надакучыла пустая балбатня. — Запомні, Муратава! Усе мужыкі добрыя, нават нізкааплатныя. Ты па справе кажы. Тут не тэатральныя падмосткі і апладыраваць тваім байкам ніхто не будзе.

— Дык я па справе кажу! Калі мужык бабе даспадобы, хай сабе на ёй пацее. Але калі яго азадак ад крэсла нельга адарваць, то такі самазваны намеснік Бога бабе ў хаце не патрэбны.

— Бытавуха! — спакойна ацаніў Палажняк сітуацыю. — А ты, чудзіла, — маёр нядобра пакасіўся на Канарэйкіна, — кіпеш падняў: «Бунт! Бунт!».

— Мой муж — сапраўдны злыдзень, — не суцішвалася Муратава. — Куды не пакладзі, усюды замінае. Колькі жанатыя, столькі мірымся. То ён крычыць: «Ты кроў маю п’еш». То я крычу: «Не п’ю я ўсякую дрэнь». «Ты ідыётка!» — лезе ён да мяне біцца. «Так, ідыётка!» — згаджаюся. — «Жыла б з генералам, была б генеральшай». Для жанчыны галоўнае, каб мужык талковы побач быў. Я ў вас спытаць хачу, грамадзянін начальнік, па якім такім праве мужчынам дазволена здраджваць, а жанчынам ані-ні. Адразу шлюхай абзавуць і пакрыюць нязмыўнай ганьбай.

Мой лозунг: кожная маці — бацька сямейства. Грудзі свае з годнасцю хачу несці, а не перацягваць з хаты на працу і з працы дахаты

— Тваё пустаслоўе, Вольга Пятроўна, прыходзіцца на мой службовы час. І тлуміць сабе галаву глупствам не дазволю. Але, паколькі бачу памылковасць тваіх меркаванняў, змаўчаць не магу. Па прыродзе сваёй мужчына — паляўнічы. І патрабаваць ад яго, каб ён быў верным аднай жанчыне, тое самае, што ў лазню пайсці і венік забыцца. На гэтым дэмагогію спыняю. Адказвай на пытанне: чаму на плошчы мацюкі гарадзіла?

— Адказваю. У кожнай, што мацюкалася, ёсць свая сумная гісторыя. Пра чужыя гісторыі казаць не буду, распавяду сваю. З мужам жыву добра, калі меркаваць па мэблі. За паўтара года, якія пражылі разам, нажылі тры аборты і выпадковае дзіця.

— Лепш адзін раз нарадзіць, чым кожны дзень галіцца! — не стрымаўся маёр, цярпенне якога амаль скончылася.

— Можа яно і так, грамадзянін начальнік. Мне гэтую праўду праверыць цяжка. Але ў паўсядзённым побыце мой мужанёк сябе не праяўляе. У хаце з’яўляецца толькі калі жэрці захоча. І пайшло-паехала: то супец яму разагрэй, то тэфтэлю распаруй. І няма гаду ніякай справы да таго, што я ўся ўзмыленая ад працы, што з языком на плячы замест каўняра, што дахаты ледзьве ногі прывалакла. Дык я яму ў адплату дулю пад наздрулю, а не піражок з какавай.

— Дарма па дробязях сітуацыю дома нагнятаеш. Табе ў кватэры прыбрацца і абед прыгатаваць, што мужыку раз плюнуць.

— Пляваць ён мастак.

— Апошні раз пытаюся, чаго буяніла?

— Дык я ж вам тлумачу справядлівасць свайго буянства. Мой лозунг: кожная маці — бацька сямейства. Грудзі свае з годнасцю хачу несці, а не перацягваць з хаты на працу і з працы дахаты. Вось пра гэта і казала на плошчы. Казала шчыра і на зразумелай мужыкам мове.

— Згодны, што баба таксама чалавек, і ваду на ёй трэба вазіць хоць бы праз раз. Але мудрасць народную не правядзеш. Нездарма кажуць: калі здарылася нешта, адразу шукай вінаватую ў гэтым жанчыну. І што б яна там ні казала ў сваё апраўданне, мацюкацца ёй дазволена толькі сярод такіх, як сама, зачыніўшыся ў жаночай прыбіральні. Там яна можа адначасова гучна выпускаць газы, пляваць на падлогу, калупаць пальцам у носе, гучна адрыгваць, распавядаць, як і каму нядаўна дала, і чухаць тое месца, дзе маглі быць яйцы, калі б яна была мужыком.

— Але ж мацюкаліся мы, каб мужыкам было зразумела, чаго мы ад іх хочам і як часта гэтага хочам.

— Калі б ты, душа мая, жыла ў пампасах, я б слова табе не сказаў. Мацюкайся, крыўляйся, хоць голая хадзі. Там клімат для гэтых штук спрыяльны. Але на плошчы з нятленным помнікам, ды яшчэ на вачах у людзей і міліцыі, такое вытварыць недазволена. Як вартавы закона, я абавязаны накласці штраф і выказаць грамадскае ганьбаванне. Сутачкамі ўзнагароджваць гэтым разам не буду. Але калі паўторыцца нешта падобнае, прыму меры па законе, якім бы строгім ні быў яго артыкул.

Палажняк яшчэ раз прагледзеў рапарт аб здарэнні. Мацюкі, згаданыя ў дакладной, былі сапраўды сакавітымі. З цяжкасцю верылася, што прыстойна апранутыя жанчыны мелі такія глыбокія пазнанні ў мацюках. Сумненні грызлі маёра і не давалі паставіць тлустую кропку ў гэтай дзіўнай справе. Ківаючы ў задуменні галавой, ён злавіў на сабе погляд аднаго з затрыманых мужчын.

— Канарэйкін! А мужыкі за што сядзяць?

— За падказкі, таварыш маёр. Яны на плошчы дзеля пацехі навучалі жанчын майстэрству мацюкацца…

Начныя нататкі

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Новая дзяржава

Гэта цалкам верагодна праз год ці крыху болей.

Запланаваны рэферэндум у Каталоніі (Catalunya), у выніку якога аўтаномная вобласць можа стацца незалежнай і выйсці са складу Іспаніі.

Трагічным для каталонцаў стаў 1714 год, калі Каталона-Арагонская Карона страціла палітычную і юрыдычную незалежнасць, а іспанскі пасад заняў кароль Філіп V.

За незалежнасць каталонцы, якія здавён лічаць сябе нацыяй, асобнай ад іспанцаў, змагаюцца амаль трыста гадоў – і маюць на гэта ўсе падставы. Каталонія – самы эканамічна развіты рэгіён Іспаніі, у ім самая высокая шчыльнасць насельніцтва. Сем з паловаю мільёнаў яе жыхароў складаюць шаснаццаць адсоткаў насельніцтва краіны, ды вырабляюць яны дваццаць тры адсоткі валавога нацыянальнага прадукту, а валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва там амаль такі самы, як у Нямеччыне! У сельскай гаспадарцы занятыя ўсяго два адсоткі працоўных, затое шэсцьдзясят чатыры (!) маюць занятак у сферы абслугоўвання пераважна на пяцістах васьмідзесяці кіламетрах міжземнаморскага ўзбярэжжа з выдатнымі пляжамі! Ганарацца каталонцы сваёй каталонскай моваю, якая пры каўдзільё Франсіска Франка Баамондэ ледзь не знікла з ужытку, але пасля таго, як дыктатуру зрынулі, імкліва адрадзілася. Ганарацца сваёй культурнай адметнасцю і такімі сусветна вядомымі асобамі, як дойлід Антонія Гаўдзі, мастакі Сальвадор Далі і Жаан Міро, оперныя спевакі Мантсерат Кабальє і Жазэп Карэрас, футбалісты легендарнай «Барсы» Віктар Вальдэс, Эрнандэс Хаві, Франсэск Фабрэгас…


У апошнія гады ў Барселоне на маніфестацыі пад лозунгамі «Каталонія – не Іспанія!», «Каталонія – новая дзяржава Еўропы!» выходзяць па паўтары мільёны чалавек, што нават уявіць цяжка!

Сёлета каталонцы перанялі акцыю прыбалтаў, якія згадвалі напрыканцы васьмідзясятых за выхад з Савецкага Саюза, – чатырыста тысяч чалавек выцягнуліся ў жывы ланцуг праз усю аўтаномію, праз восемдзесят шэсць гарадоў і мястэчак, ад Валенсіі да Францыі! Акцыя пачалася ў 17.14, і такім чынам нацыя згадала трагічны ёй год.

«Independencia!», «Adéu, Espanya!», «Goodbye, Spain!» – такія надпісы-графіці на свае вочы не раз бачыў я на платах і будынках у Барселоне, у Січэзе і ў Фігерасе.

Урэшце, чым Каталонія горшая за Партугалію, якая была падуладнай Іспаніі ў XVI–XVII стагоддзях?

Вольналюбівая нацыя не проста жадае, яна неўтаймоўна прагне незалежнасці. І, несумненна, вырвецца з хцівых



імперскіх абдымкаў, мірным і цывілізаваным шляхам дамажацца свайго!

Еўракамісары цвердзяць, што незалежнай Барселоне не будзе месца ў Еўразвязе і яна мусіць стаць у доўгую чаргу, каб патрапіць у гэтае міждзяржаўнае аб'яднанне. Але прэм'ер-міністр Каталоніі Артур Мас парыруе: «Ад гэтага сем з паловаю мільёнаў каталонцаў не перастануць быць еўрапейцамі!»

11 верасня 2013 года.

Гэтае салодкае слова – свабода!

Прынеслі мне з крамы «Белсаюздруку» паўтузіна паштовак са сталічнымі краявідамі. Панаклейваў маркі ці, як кажуць паштавікі сваім груваткім канцылярытам, знакі паштовай аплаты.

Адну з іх, з відарысам пляца Волі, сфатаграфаваным Сяргеем Плыткевічам з вышыні птушынага палёту, закарцела падпісаць і адправіць Алесю Бяляцкаму да дня народзінаў наўздагон той, што нырцанула ў сінюю скрынку заўчора. У Велікодны сонечны кадр спрактыкаванага майстра патрапілі і менская ратуша, і галоўныя беларускія хрысціянскія храмы, і касцёл святога Язэпа, і кансерваторыя, і гатэль «Еўропа», і грузінская амбасада пад бела-чырвоным сцягам з пяццю крыжамі…

Падумалася, што, мабыць, у папраўчай калоніі №2 у Бабруйску цэнзару, які ўдзельнічае ў нібыта выпраўленні і выхаванні пісьменніка, праваабаронцы, намінанта Нобелеўскай прэміі міру, таксама спадабаецца гэтая прыгожая еўрапейская плошча. Ці, можа, ненавісныя перлюстратару нават самі словы «свабода» і «птушыны палёт»?! І хто ён сам – інтэлігент ці вайсковец, гадаванец Львоўскай вышэйшай вайскова-палітычнай вучэльні ці выпускнік аддзялення рускай філалогіі педуніверсітэта? І ці салодкае гэтае слова на смак яму? Ці, можа, горшае за чорную рэдзьку? А можа, заядае ён кожнае дзяжурства заварнымі пірожнымі ці бланманжэ? Або наадварот, запівае «хрушчовікам» пірцоўкі?

Спрактыкаваная ў ліставанні Тамара М. раіла пісаць у месцы зняволення простыя словы пра самыя простыя рэчы, бо калі толькі хаця б што-небудзь насцярожыць цэнзара, дык паштоўка неадменна паляціць у смеціцу.

Апошнім часам, як Алесь быў на волі, дык нярэдка сустракаўся з ім на плошчы Перамогі, бо непадалёк ад яе ён жыў, а я працаваў. Ці наадварот, перакрыжоўваліся пры «Акадэмкнізе», бо ягоны офіс мясціўся ў двары, дзе жыву я.

На адной з ранейшых паштовак з выявай плошчы Перамогі развітваўся словамі «Да сустрэчы на плошчы Перамогі!», а таму сумняваюся, што патрапіла яна да бабруйскага нявольніка, бо не атрымаў на яе адказу.

Яшчэ больш балюча было пісаць яму ў калонію №8 (нібыта ў маім родным горадзе з дзясятак тых калоній!), бо зусім не гасцінна прымаў яго Жодзіна.

Чамусьці згадаўся даўні палітычны дэтэктыў – кінафільм Вітаўтаса Жалакявічуса «Гэтае салодкае слова – свабода!». Вязні ў ім патрапілі на свабоду, а таму верыцца, што хутка мінецца патрэба ліставацца, што зноў увачавідкі будзем бачыцца на пляцы Волі, на плошчы Перамогі, на іншых вольных пляцах, бульварах, вуліцах і праспектах!

23 верасня 2013 года.

Цмокі поруч з намі

Лепельшчыну здавён любім і вяльбуем усёй сям'ёю.

Амаль васямнаццаць гадоў сябруем з сям'ёю фізікаў Сяргея і Тамары Мацкевічаў, а Томіна мама Вера Ільінічна жыла ў азёрным краі ў вёсцы Чарэйшчына. Праз тое не раз выязджалі туды ў грыбы, а дачка Хрысціна нават заставалася ўлетку на некалькі тыдняў з сяброўкай-аднакласніцай Верачкай на вакацыях у бабы Веры. Адтуль, ад коткі Машкі, прывезла яна і папаўненне ў нашу сям'ю – трохтыднёвае кацянятка, якое назвалі Тайгаю.

Часта праязджаў праз Лепельшчыну ў сваіх вандроўках на Браслаўшчыну, на канферэнцыі, імпрэзы і выставы ў Полацак, у адведзіны да дзядзькі Рыгора ў Вушачу, на літаратурна-мастацкія пленэры на радзіму Васіля Быкава ў Бычкі. Колькі разоў удалося выбірацца з сябрамі і на рыбу на тамтэйшае возера Нéграза, якое нагадвала і сугучнай назваю возера Нéшчарда з ягонымі дзівоснымі паданнямі і помнікам Яну Баршчэўскаму.

Прыемна было дазнацца, што ў Лепелі ўсталявалі помнік канцлеру Вялікага княства Літоўскага Льву Сапегу. Аказалася, што канцлераў цёзка скульптар Леў Аганаў вырабіў і выяву Цмока Лепельскага паводле апісання Уладзіміра Караткевіча ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

Кампанія «Будзьма беларусамі!» намагаецца вярнуць Цмока з народнай памяці, давесці, што і ён, як легендарная Нэсі шатландцаў, робіць беларусаў адметнымі і ўнікальнымі. Больш за тое, запрашае яна карыстальнікаў «цмачынага» сайта выпраўляцца ў падарожжы, каб шукаць свайго Цмока. Як вядома, на Старажытным Усходзе Цмок быў добрым баствам, а вось у хрысціянскай традыцыі стаўся нячысцікавым сімвалам. У некаторых беларускіх казках зло, з якім барукаліся асілкі, увасабляў Цуда-Юда – выродак у цмачынай радзіне, у пэўных паданнях цмок аказваўся пярэваратнем, але найчасцей беларускі Цмок – лагодны і добразычлівы. Нездарма азначэнне дракона ў нашай мове супадае не толькі з гукапераймальным «цмок», адрывістым гукам, які атрымліваецца, калі рэзка раскрыць сціснутыя вусны. Зацеміў я і тое, што ў размоўнай мове «цмок» азначае і пацалунак! Гэта вельмі сур'ёзна, гэта не які-небудзь там англамоўны кашэчы «kiss»!

Пагаджаюся я і з тым, што быць за Цмока – зусім не значыць адрыньваць бусла ці зубра, як традыцыйныя сімвалы Беларусі.

У складзе экспедыцыі шукальнікаў беларускага Цмока пад парасонам кампаніі «Будзьма беларусамі!» журналіст і блогер Глеб Лабадзенка аб'ехаў ці не ўсю краіну ад Браслава да Турава. Як кажуць, здымаю капялюш на знак павагі і падзякі за ягоныя рэпартажы. Вось толькі са сцвярджэннем, што сёлета ў Лепелі паставілі першы і адзіны ў Беларусі помнік Цмоку, пагадзіцца аніяк не магу. Ага, знайшоў люльку ў зубах!

А калі падгаворваў я Тамару Мацкевіч, якая, дарэчы, Дракон з года нараджэння паводле ўсходняга календара, паехаць са мною, дык зусім не шукаць, а толькі адведаць Цмока, які чвэрць стагоддзя някепска пачуваецца ў двары нашых колішніх дамоў у сталічным мікраёне Уручча-1…

Каб ізноў пабачыць Цмока Уручанскага, трэба было і праўда выехаць за кальцавую аўтадарогу. Крыху хваляваўся, бо даўно не бачыў яго, — ці ацалеў, ці стаіць на сваім месцы?! Падумваў, што лацініцаю трэба было б пісаць пра яго праз вялікую літару О, бо ў слове cmOk утрымлівалася б і пазітыўнае спалучэнне Ok! (all correct – усё хораша!), якое мацуе надзею.

Уздыхнуў з палёгкаю, калі нарэшце згледзеў знаёмы сілуэт сярод сасёнак на натуральным пагорку перад дзіцячай пляцоўкаю ў двары дома №32, што па вуліцы Русіянава. (Часам нават і не падазраем, што мы маем! Зусім не выключаю, што стаяць гэткія сімпатычныя Цмокі і ў іншых беларускіх мясцінах!)

Прывітаўся з трохгаловым бамбізаю, пацёр «на шчасце» шурпатую і крыху замшэлую «скуру», абышоў з усіх бакоў з фотаапаратам. Цікавых і выйгрышных ракурсаў было багата, але трэба было і адысціся як след, каб дабрадушная істота цалкам патрапіла ў кадр, бо адно толькі ўвышкі яна сягае пад чатыры метры. А каб тое давесці, давялося і самому папазіраваць пры ім, стаць замест маштабнай лінейкі!

На сваім спрадвечным пагорку Цмок Уручанскі атабарыўся напраканцы васьмідзясятых гадоў, і не адно пакаленне мінчукоў-малалетак коўзалася на ягонай спіне, гадавалася пад лагоднымі і дабрахотлівымі позіркамі. Не аднаму пакаленню быў ён за старэйшага сябра і дабразычлівага выхавацеля, а калі ўзяць пад увагу час ягонага з'яўлення, дык можна залічваць яго і ў змагары-адраджэнцы. Ад пачатку быў ён не самотны, але адзіны здолеў выстаяць у тамтэйшай міфічна-казачнай сябрыне. Двух масянжовых буслоў даволі хутка спілавалі пад корань вандалы. Выстаяла, а дакладней, выседзела Царэўна-жабоцька – яшчэ адна прэтэндэнтка на агульнанацыянальны брэнд, – аднак не здолела захаваць, зберагчы свае пярэднія лапы. Не пашкадавалі вылюдкі і Жар-Птушку – адпілавалі ёй лапкі разам з рамкаю, што намякала на залатую клетку!

Уручанскі парк скульптур – гэта найхутчэй вынік мастакоўскага пленэра ці конкурса студэнцкіх дыпломных работ. Але містыку тут адрынуць аніяк не выпадае, бо ні аўтараў ідэі, ні скульптараў-выканаўцаў знайсці аніяк не ўдаецца. Не могуць даць рады ні Міністэрства культуры, ні аддзел будаўніцтва і добраўпарадкавання Мінгарвыканкама, ні аддзел культуры Першамайскага райвыканкама (які казачным чынам перакінуўся ў аддзел ідэалогіі), ні жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак №96, на чыёй тэрыторыі па ўскрайку хваёвага лесу безпрапісачна пасяліўся Цмок, ахутаны таямніцамі. Ці не ад Нямігі або Свіслачы прытупаў ён у зацішны лясок?

Як толькі ні называюць знак у электронных адрэсах – хто малпачкаю, хто сабачкам, хто слімачком, а хто і казяўкам! А вось мой даўні прыяцель, графік Рыгор Сітніца надыктоўваў быў каардынаты Саюза мастакоў і ўжыў у гэтым значэнні слова «цмочак» – маленькі цмок! Але і ў кіраванай ім пашанотнай творчай суполцы анічога не ведаюць пра цмокатворцаў. Але гэта і лагічна – Цмок мусіць заставацца міфічным і легендарным.

…Добра было б, каб ужо сёння пралёг турыстычны маршрут паўз уручанскія цікавосткі!

13 лістапада 2013 года

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 4 (92) | 25 красавіка 2014 | № 16 (385)
Новы час

«Шчасьця Вам, дарагія,


Калядныя вершы Ларысы Геніюш

Вітаўт Тумаш, рэдактар пражскага зборніка Ларысы Геніюш, доўгі час у Амерыцы быў захоплены ідэяй апублікаваць вершы паэткі. Што зашкодзіла? Не адсутнасць матэрыялаў і не фінансавыя цяжкасці (дырэктар БІНіМа ўмеў знайсці неабходныя грошы). Хутчэй за ўсё, працу над укладаннем кнігі спыніла думка, што заакіянскае выданне зможа толькі ўскладніць падсавецкае жыццё паэткі.

Ад неажыццёўленага праекту засталася нізка лістоў Ніны Абрамчык (архіў БІНіМ) — галоўнай паплечніцы Вітаўта Тумаша ў гэтай справе, ды некалькі вершаў Ларысы Геніюш, дасланых у розны час з лістамі ў сям'ю Тумашаў (дзе, разам з усёй карэспандэнцыяй паэткі і захоўваюцца сёньня). Гэтыя лісты ды вершы і прапануюцца ўвазе чытачоў.



Ніна Абрамчык



Ларыса Геніюш



5.11.53.
Дарагі Вітаўт,
«Раніцу» маю, пачынаючы з 35 нумару. Вершы ёсьць — больш за 40. Зраблю так, як было сказана ў лісьце, але: 1. якім шрыфтам перапісваць? кірыліцай ці лацінкай? (маю абедзьве машынкі); 2. справа ь (мяккага знаку): ці як там друкавалася, ці як цяпер «Бацькаўшчына» піша (напр., бязь, празь, зь — дзе трэба, зразумела). Гэтае апошняе, безумоўна, правідлова (хоць «Божым Шляхам» — не прызнае). 3. Можа, трэба фота Ларысы Г[еніюш]? Тое «вясёлае» маю, што «спозьнілася» ў першы зборнік.
Чакаю на хуткі адказ, а пакуль усяго найлепшага і прывітаньні Сямейцы.
Ніна.

19.11.53.
Дарагі Вітаўт,
высылаю І-ы экзэмпляр вершаў Л. Г. [Ларысы Геніюш. — Рэд.] з «Раніцы» і «Беларускага Работніка», якія не ўвайшлі ў зборнік «Ад Родных Ніў».
Лісту з «паясьненьнямі» не дачакалася, а паколькі мела час, дык перапісала. Калі штось невыразна — пішы, спраўджу з арыгіналам. Зазнач толькі старонку, загаловак верша і мейсца (верша ня трэба пасылаць, бо 1 экз. пакідаю сабе). ІІ-гі экз. вышлю на днях, каб ня разам (каб не загінулі).
Затым усяго найлепшага і прывітаньні.
Ніна.
П. С. Ці выслаць фота Л. Г.?

21.11.53.
Дарагі Вітаўт,
толькі што атрымала Твой ліст з «паясьненьнямі», але паскольki ўжо перапісала раней і І экз. ужо выслала 18.11.53, дык так ужо і будзе. Мяккі знак дастаўляла (мо дзе толькі забылася). 1. Сягоньня высылаю 2-гі экз. «Ад родных ніў» маю 1 экз., але калі ў Вас там ні ў кога ня знойдзецца — прышлю, пазычу (але толькі пазычу). 2. Фота высылаю, але тако-ж толькі пазычаю, па выкарыстаньні, ці калі непатрэбна — зьвярнуць.
Затым усяго найлепшага. Прывітаньні ўсім.
Ніна.

25.11.53.
Дарагі Вітаўт,
вось што значыць пачаць з жанчынай перапісвацца, дык супакою ня будзе, закідае лістамі. Але мне на лісты адпішаш, як будзеш мець час і спакой — гэта нясьпешна. 1. Маю спадзею, што вершы (2 экз.) і фота Л. Г. [Ларысы Геніюш. — Рэд.] — атрымаў. 2. У Міколкі [Абрамчыка. — Рэд.] ёсьць у архіве вельмі прыгожае фота Л. Г. Хай мне ён напіша, дзе яго знайсці — прышлю. 3. Ці ёсьць там у Вас «Ад родных ніў» — ці прысласць, пазычыць? 4. Маю перапісану на машынцы «Нарач» Максіма Танка, 2 экз., мо прысласць? (трэці экз. хтось «пазычыў»).
Усё!
Усяго найлепшага й прывітаньні Сямейцы!
Ніна.

5.12.53.
Дарагі Вітаўт,
пакет зь лістамі і вершамі атрымала — дзякую.
Сяньня Табе высылаю: 1. «Ад родных ніў» — на ўласнасьць, а не на пазыку, але глядзі, беражы, не згубі, бо больш не дастанеш. 2. Ліст з а) датамі вершаў Л. Г. [Ларысы Геніюш. — Рэд.] у «Раніцы»; б) аўтабіяграфію Л. Г.; в) верш, які апусьціла раней. 3. Мікракопіі каштуюць каля 30 фр[анкаў] за старонку. У расейскіх прыватных фірмах на 4 фр[анкі] таньней, але — могуць згубіць кнігу. Ужо так было. Тады лепей адбіць у салідных бібліятэках. Мо ў Вас таньней, лепей мо перасласць (пазычыць), бо ці я спраўлюся з гэтымі рэчамі. Маю толькі «На этапах» і «Журавінавы цьвет» [зборнікі Максіма Танка. — Рэд.]. 4. «Нарач» [паэма Максіма Танка. — Рэд.] машынапіс — прышлю, чакаю, бо пазычыла людзям «перапісаць». 5. Фота Л. Г., што я прыслала — зрабіць копію, а тое выслаць мне назад, баюся, каб не згубілася. 6. Пра Каліноўскага «Мужыцкую Праўду» рапарт — не магу знайсці гэтай кніжкі, бо бібліятэку нашу парадкавалі студэнты, дык ня толькі чорт, але й жанчына толку ня дойдзе.
Жыве Беларусь!
Прывітаньні!
Ніна.

21.12.53
Дарагі Вітаўт,
атрымала ліст з падзякай за цэнны падарунак (кніга Л. Г. [Ларысы Геніюш. — Рэд.]) і сьвяточнымі прывітаньнямі. Наўзаем жадаю Вясёлых Каляд і Шчасьлівага Новага Году!
Ад Міколкі [Абрамчыка. — Рэд.] тако-ж атрымала сягоньня ліст, н'ат з «сьвяточнымі пажаданьнямі» — гэта дык рэдкасьць!!!! Ясна — «ня меў часу» пісаць.
Кнігі Танка перашлю, калі напішаш, трэба будуць, каб зрабіць мікрафільм.
Пра Купалу ў бібліятэках пашукаю.
Аб Каліноўскім дагэтуль нічога не знайшла ў нашай «бібліятэцы».
Прывітаньні ўсёй сямейцы.
Ніна.
П. С. Калі спаткаеш дзе-колечы якісь беларускі ўзорык, выстрыжы яго ножнічкамі і перашлі мне, я зьбіраю калекцыю, раблю альбом, маю ўжо больш за сто. Н.

[Ліст недатаваны]
А чый гэта верш? Мо' Ларысе [Геніюш. — Рэд.] у зборнік бракуе?

Ткала, ткала дзяўчына паясы,
Узор брала з жытняе паласы,
Белацьвет і гібкія каласы,
Рамонкі і сінія васількі
Усьміхаліся дзяўчыне з-пад рукі.
Пра малінаў пах і сок брусьніц,
Пра захады сонца, усход зарніц,
Пра стан гібкі жнеяў-маладзіц
Думала дзяўчына, паясы ткучы,
Пра месяц і зоры думала ўначы.
Сьніла дзяўчына пра мілага сны.
Сьніла дзяўчына бярозы вясны.
Сьніла дзяўчына шум-гоман лясны.
Жнеяў сьніла дзяўчына галасы —
Гэта ўсё ўткала ў паясы.

Парыж, 16.1.54.
Дарагі Вітаўт,
пакуль што пра Купалы кнігу нічога не даведалася, былі сьвяты, загультаілася, ды мо' шчэ напалохалася, што Ты амаль мяне за «секлятарку на Эўропу» ангажуеш.
Затым — набралася сьмеласьці, ваяўнічасьці і — выразала сьляпую кішку. Вось ужо 4-ы дзень. Усё-ж часамі людзі кажуць праўду, а я прывыкла ня верыць, і думала, што гэта нешта-нейкае. А вось ніякага болю, трошкі першыя дні перамучыла тэмпэратура нармальна — ужо 3 дні хаджу.
Пішу аб гэтым і Міколку, але вытлумач яму «фахова» — па-лекарску, што гэта драбніца, каб ён не пераймаўся, бо мае і так шмат клопату. Не было сэнсу далей трымаць яе, бо запраўды яна мне дакучала.
Затым прывітаньні Тваім усім пацехам і знаёмым. Тут буду яшчэ некалькі дзён.
Ніна.

4.2.54
Дарагі Вітаўт,
вельмі дзякую за прывітаньні і пажаданьні здароўя. У мяне ўсё добра. Фактычна ўжо здарова, але па старой звычцы не адходжу ад хаты, ды яшчэ й таму, што тут «зіма». У Эўропе «мароз» (у Гішпаніі — 31^{0}С, у Парыжы — 18^{0}С, у нас на вёсцы — 20^{0}С, у Даніі — 11^{0}С, у Штокгольме — 2^{0}С), як бачыш, шыварат-на выварат. Тут сьмяюцца, што сьвяты Ільля слухае загадаў Малянкова «рабіць усё навыварат, як дагэтуль было».
Што да справаў, каб Табе заладзіць, як бачыш, усё замарозіла. Гэтак і з гэтай апошняй просьбай. Наша «бібліятэка» ў Парыжы, а ня тут, а я туды цяпер ня еду, ды такой кніжкі я й ня бачыла ў нас. Ёсьць толькі «Адбітае жыцьцё» — Луцкевіча (Навіны А.).
Падтрымоўвай як-колечы Міколку на духу. Цяпер няма чаго пераймацца, небясьпечна было тады, калі апэндыцыт у баку калоўся.
Прывітаньні ўсім, усім і ўсяго найлепшага.
Вашая Ніна.

14.6.60
Дарагі Вітаўт,
як маешся, што чуваць?
Даўно, даўно ўжо я выслала Табе фота Ларысы Геніюш, калісь, як выслала яе вершы. Гэтае фота з архіўнага альбому. Маю надзею, што Ты яго маеш, і таму вельмі прашу, так, як Ты калісь прасіў, прышлі мне яго назад, і то як магчыма хутчэй, назад у гэты архіўны альбом. (Фота, дзе Ларыса сьмяецца, на адвароце напісала яна сама нам).
Што-ж чуваць у Цябе і сярод нашых там за морам? Ці помняць шчэ Эўропу і ці тужаць за ёй, галоўна маладыя?
Тут у мяне глухая цішыня, як у глыбі Палесься, шумяць толькі бярозы ды стрыкочуць конікі ў траве. Калі Ты чуў апошні раз шум бярозаў?
А там, яшчэ далей, за Прыпяцьцю, за Сожам, Танк начапіў на нос акуляры, надзеў цёплыя калошы і пачаў пісаць яшчэ горш, як раней. Нават сам, бедны, аб гэтым прызнаецца.

далёкія»

Маю весткі ад Бацькоў — жывуць... Якое жыццё! У Міколкі якраз апошні ад іх ліст. Часьценька заглядае да іх Піліп, каб пачытаць мае лісты. Нам усім перасылае свой далёкі гарачы прывет! Ён аграномам у Кобрыні. Шурка Засім — там недалёка лекарам. Люсьцібэр, Жодзік — загінулі. Нічога не ўспамінаюць пра Яромку. Жэня Волас — дырэктарша сіраціндца ў Берасьці. Валя Засім — там настаўніцай (у Берасьці). Пра Стаўбунікаў не ўспамінаюць. Кліма Валодзю — немцы замардавалі (расстралялі) у Баранавічах. Ці спатыкаецца з Вамі ўсімі Дарафейчук Сашка — ён каля Нью Ёрку?

Калі маеш час і настрой — напішы мне пару слоў. Я зьбіраюся Ксені [жонка В. Тумаша. — Рэд.] напісаць даўжэзны ліст, але ў мяне так туга ідзе пісаньне. Як-жа твае дочкі, «брацік» — ужо мусіць ростам Цябе даганяюць? Мой Алік маленькі.

Прывітаньні знаёмым, пішы, усяго найлепшага. Жыве Беларусь.

Ніна.

***

Каляда, ноч плыве ў задуменьні,
Ў небе зорка ўрачыста гарыць.
На стале сьнежна-белым, на сене
Куцьця зь мёдам і з макам стаіць.
Калядуе вятрыска па сёлах,
Расплываецца ў небе дымок,
Ў гэты вечар харошы да болю
Дамоў людзі сьпяшаюць здалёк.
Для усіх адчыняюцца дзьверы,
Хопіць месца за шчодрым сталом,
Сяньня ў хатах Сьвятая Вячэра,
Ноч Сьвятая плыве за вакном.
Шлем Вам сёньня, Браты ў чужыне,
Пачуцьці, што ад сонца цяплей,
Пажаданьні, тугу, успаміны
І любоў, і сьлязіну з вачэй.
Шлем Вам пасма надзеяў-вясёлкаў
У Калядны густы сьнегапад,
Каб сустрэцца на радасным золку
Ля прыветлівых бацькаўскіх хат!
Не забыліся мы, не забудзем
Тых, што доля забрала ад нас,
Мацярынскай тугі не астудзіць
Ні далёкая ростань, ні час.
А пакуль пажадаем ня многа
Ўсім, хто ў роскашы з Вас ці ў бядзе,
Не забудзьце да сёлаў дарогі,
Не зрачэцеся Маці нідзе!

10.XII.73 г.

***

Сьнег кладзецца на сьцежкі, на пожні,
Сьнежань шэранем дрэвы пакрыў,
Неапаўшае лісьце апошняе
На галінах мароз захапіў.
Каляда будзе сёлета белая
Пад марозны пад ботамі хруст.
Страпянецца душой набалелаю
Ў гэты вечар мая Беларусь!
І адкінуўшы справы штодзённыя,
Засумуе сардэчна па тых,
Хто здалёк гэтай ночку сьцюдзёнаю
Рвецца сэрцам да сёлаў сваіх.
Дачакацца-б хвіліны прыветлівай,
Ўбачыць радасьць у братніх вачах.
Хаты родныя вокнамі сьветлымі
Паглядаюць ў задуме на шлях.
А пакуль прывітаньні Вам, братнія,
Пажаданьні здароўя для Вас,
З сэрцаў, з дум, зь цеплыні нашай хатняе
Шлем Вам ў гэты засьнежаны час!
Каляда, Каляда над зямелькаю,
Сыпле сьнег на дарогі зіма,
На стале сяньня ўсякага-ўселькага,
Толькі госьцейкаў родных няма.
Шчасьця Вам, дарагія, далёкія,
З намі Вы ў кожны радасны час,
Няхай мачыха-доля нялёгкая
Будзе радаснай, лёгкай для Вас!
Хай ў здароўі Вам добра жывецца,
Вы ёсьць косьць наша, нашая кроў.
Няхай грэе Вам шчырыя сэрцы
Беларуская наша любоў.

З Новым Годам! У казачны вечар
Сэрца-чаркі за Вас мы ўзьнялі.
Да сустрэчы, Браты, да сустрэчы
Ў добры час на радзімай Зямлі!

10.XII.1973 г.

***

Каляда ўрачыста крочыць сьвята,
Наўпрасткі празь белы сьнег і лёд.
Калядуе вецер каля хатаў,
Запынаецца каля варот.
Нарадзіўся Бог Спрадвечны ў ясьлях,
Сьвеціць зорка, зіхаціць назьдзіў,
Яна болей у небе не пагасьне,
Каб ніхто з дарогі не зьмыліў.
Над убогім хлевушком ірдзіцца,
Ворагам яе не пагасіць,
Йдуць Цары Дзіцятку пакланіцца,
Што ў быдлячых ясельках ляжыць.
І ня знаючы людзкое мовы,
Толькі веліч здольныя адчуць,
Паглядаюць з ласкаю каровы,
І ягняткі радасна бляюць.
Пахіліла галаву Марыя,
Пастушкі спыніліся ў дзьвярох,
Пяюць ў небе ангелы сьвятыя.
Нарадзіўся ў ціхіх ясьлях Бог!
Сыпіць Дзіця ля Непарочнай Маці.
Божы Сын, пачатак новых дзён.
Пастушкі стаяць каля Дзіцяці.
Мудрацы яго вартуюць сон.
Сьвет няземскі ля галоўкі зьзяе,
Рука Маці ля маленькіх ног.
Урачыста ноч плыве сьвятая.
Нарадзіўся ў Бэтлееме Бог!

11.XII.1973 г.

***

Каляда, сее вецер сьнягі па загонах,
У сумёты згартае бясконцую бель,
Каляда-Сьвяты Вечар па хатах сягодня,
Калядуе пад вокнамі сумна мяцель.
Але сьцішыцца, стоміцца недзе пад горкай,
Ці прыпадзе ў зьнямозе да белай зямлі,
Каб на небе жаданую, першую зорку
Нашы людзі ўрачыста пабачыць змаглі.
Можа хто заблудзіўся ў жыцьці, як у лесе,
Шлях да праўды загублены цяжка знайсьці,
Дык асьвеціць прасторы зара
з паднябесься
І пакажа дарогу, якою ісьці.
Каляда — сяньня ў хатах сыноў
ўспамінаюць,
І здалёк на Куцьцю іх чакаюць дамоў.
Ў нас-жа ўсюды па сьвеце радня дарагая,
І ў сэрцах, як раны, туга і любоў.
Дык са Сьвятам, Браты,
каб шчасьліва жылося,
Былі добрыя людзі братамі для Вас,
З Новым Годам, Браты,
каб усё Вам збылося,
Чаго зьдзейсьніць ня здолеў суровы
наш час.
Цэняць людзкасьць заўсёды
дастойныя людзі,
Дабрыню і сумленьня, адвагу, ня страх,
Дык былі мы заўсёды, мы ёсьць
і мы будзем,
Сяньня нашая доля ў нашых руках!
З Новым Годам, Браты,
няхай розум заўсёды,
Чалавечнасьць у Вашым жыцьці, як маяк,
Хай адвага у сэрцах ды сіла ў нягодах,
Хай калядная зорка Вам сьвеціць на шлях!
Калі ўціхацца, зьмірацца людзі нарэшце,
І дабро пераможа у сьвеце над злом,
Кожны знойдзе сваё ў нас, пачэснае месца
За сямейным, за нашым народным
сталом.
У жыцьці ўсё бывае, складаецца розна,
І спаўняюцца часам матуліны сны,
Прыляцяць што, зьбяруцца,
як птушкі да гнёздаў,
Да зямёлькі, да роднае маці сыны!
Людзям нашай зямлі сьнег і сьцюжа
ня шкодзяць,
Ў нас насуперак сьцюжаў у сэрцах агні,
Ад халодных вятроў не ўцякаем
на поўдзень,
А вартуем парог свой у нялёгкія дні.
Кружыць сьнег густым роям
над нашымі хатамі,
У белым кужалі дрэвы стаяць і кусты.
З Новым Годам, з Каляднымі
нашымі Сьвятамі,
Дарагія Суродзічы: Сёстры, Браты!
Пажаданьняў у сэрцы сабралася многа,
Іх ня выказаць сяньня Вам, не пераслаць.
Заставайцеся, Брацьця, Шчасьліва і з Богам!
Жыць Вам доўга й ніякага гора ня знаць!

5.XII.1976 г.

***


Ідзе ў белым зіма, Каляда на парозе,
Сее вецер па грудзе замерзлай сьнягі,
Чырванеюць аблічча дзяўчат на марозе,
І шчыльней зашпіляюць дзядзькі кажухі.
Сяньня неба бяз хмар, чысьціня ледзяная,
Кроны дрэваў бязьлістых, як тканы узор.
Вецер гольлі, бы ніці, усё пераплятае,
І па сіні нябёсаў снуе ў перабор.
Цёткі посьцяць яшчэ, дзеці ў хаце
шчабечуць,
Праз падаркі, ялінку ды цацкі пад ёй.
А здалёк ўжо Сьвяты набліжаецца Вечар,
Калі зноў прагучыць Каляда над зямлёй.
Ужо зорка ўзышла, ды вятры калядуюць,
Ўсе чакаюць, што нехта надыдзе здалёк,
І у бацькавай хаце Вячэру Сьвятую,
Як калісьці, супольна разьдзеліць Сынок.
Гэтак ў нас ўжо вякі род зьбіраецца ў хату,
Ў гэты Вечар Сьвяты ўсе да Маці ідуць,
Ўспамінаюць праз тых, хто ня з намі
на сьвята,
І старыя калядкі запоўнач пяюць.
Ўсіх Вас шчыра вітаем са Сьвятам
Калядным,
Недзе й Вы за сталом, і на сене Куцьця,
Мы жадаем Вам шчасьця, ад лёсу спагады
І павагі людзкой на дарогах жыцьця!
З Новым Годам вітаем, хто з нашага роду,
З Новым Годам ўсіх добрых людзей.
Няхай будзе шчасьлівы, бязхмарны, пагодны
Гэты год, што насустрач нам сяньня ідзе!

17.XII.78 г.

***

Па Беларусі сьнег трусіць, трусіць —
Памол пшанічны на каравай,
Палі пакрыла льняным абрусам,
Ў сьвяточнай белі наш родны край.
Белаю сьнежань йдзе пуцявінай,
Белую пражу вятры прадуць.
Ў белых сьвітках стаяць яліны,
Белыя стрэхі, бель у саду.
Гэтак ўрачыста, бела-сьвяточна,
Чаруе сэрца спакой краса.
Новаму Году хтосьць відавочна
Посьцілкі нашы ля ног разаслаў.
Чакаем госьця паважна, моўчкі,
Яшчэ ня ўсе з нас каля сьвят.
Зазвоняць чаркі сьвяточнай ноччу –
Сьлёзы зазвоняць па дарагіх.
Кажуць, багата, добра на сьвеце.
Усё-ж роднай Маці гэта няўцям.
Яна хацела-б бачыць ля сэрца
Кожная сяньня сваё дзіця.
На Беларусі сьнег трусіць, трусіць,
Сьняжынкі пухам да ног ляцяць.
Браця далёкія — шэрыя гусі,
Зноў ў нашых хатах бяз Вас Куцьця.
Мак і грыбы, сена пах пад абрусам,
Пахне ялінка, рамонак, чабор.
Ўспомнім усіх, хто дамоў не вярнуўся,
Вынясем й продкам вячэру на двор.
Шчодра сягоньня падкінем у жолаб,
Клікнем суседа, калі без сям'і.
Вечар Сьвяты для людзей, для жывёлы.
Божая міласьць для ўсіх на зямлі.
Са сьвятам, Браты, Вас, яшчэ
з адным годам.
Хай вера у сэрцах і сіла ў грудзёх.
Любоў паміж намі, сяброўства і згода.
Хай ступіць надзея на родны парог.
Стаўляйце вячэру на сена, сястронкі,
Хай з макам і з мёдам усюды Куцьця.
Хай словы вітаньня з радзімай старонкі
Ад матчыных сэрцаў да Вас даляцяць!

[197?]



Падрыхтоўка да друку Лявона Юрэвіча.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 4 (92) | 25 красавіка 2014 | № 16 (385) Новы Час

Экскурсія па гомельскім «Палацы»

Сяржук СЫС

Выйшаў першы нумар літаратурнага альманаха Гомельскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў «Палац».

На яго старонках — проза, паэзія, творчая спадчына, гістарычныя і літаратуразнаўчыя матэрыялы, прысвечаныя мінуламу і сучаснасці Гомельскага краю.

Па праўдзе, на Гомельшчыне гэта не першая спроба сабраць пад адной вокладкай разнастайныя па жанрах і мастацкіх вартасцях творы мясцовых аўтараў, ды, так бы мовіць, зверыць тамтэйшы літаратурны пульс. Аглядаючы мінулае, назаву некалькіх папярэднікаў «Палаца»: гэта, найперш, выхад у свет у 1934-м, а затым, пасля доўгага перапынку, у 1958 годзе альманаха «Літаратурны Гомель». У 90-х выйшлі тры нумары альманаха «Магістраль», выдання няроўнага як у мастацкіх, так і паліграфічных адносінах. Нечаканым і цікавым стала з'яўленне паэтычнага альманаха «Святло шчымлівай памяці», які выйшаў у 2006 годзе накладам 700 асобнікаў. У зборніку былі прадстаўленыя каля 80 імёнаў як досыць вядомых сярод аматараў паэтычнага слова, так і пачаткоўцаў. Да выдання самых разнастайных літаратурных анталогій і альманахаў спрычыніўся вялікі руплівец літаратуразнаўства, прафесар ГДУ імя Ф. Скарыны Іван Штэйнер. Прыгадаю толькі некалькі грунтоўных зборнікаў, якія выйшлі дзякуючы яго намаганням: анталогіі лірыкі выпускнікоў ГДУ «Крыніцы», «Універсітэт літаратурны», «Рэчыца літаратурная», «Дняпроўскія матывы».

Тое, што новы альманах узнік не на творчай няўдобіцы, а на трывалым падмурку, узведзеным папярэднікамі, дазволіла ўкладальнікам смела шыбаваць далей, пазбягаючы ранейшых недахопаў.

Аднак пачнем абяцаную экскурсію: разам зойдзем у «Палац», нетаропка агледзім светлую залю «Паэзіі», ганаровую галерэю «Прозы» ды па лесвіцы «Літаратуразнаўства» падымемся на гаўбец «Спадчыны»...

Паэтычны раздзел атрымаўся багаты як на змест, так і на імёны. Тон тут задае Віктар Ярац. Здаецца, няма на яго творчае стомы: з уласцівай яму гукавой чысцінёй радка, навізной метафар, дакладнасцю паэтычнага параўнання ён падыходзіць да філасофскага асэнсавання лірычным героем яго Радзімы, дзе:

...у жніўны дзень,
праменнямі спавіты,
іду пачуць спрадвечны сказ вякоў:
там каласы —
праўдзівым шэптам жыта,
там шчырасцю — сінеча васількоў.

Не здае творчых пазіцый і «славянская» — у добрым сэнсе гэтага слова — паэтэса Таіса Мельчанка, якая нястомна шукае свае «вытокі» ў мінулым ды ўдала прасвечвае іх праз прызму сучаснасці. Сярод перлін рубрыкі — творы тонкага знаўцы патаемнага сэнсу слоў Генадзя Лапаціна. А ў веткаўскай паэтэсы Ларысы Раманавай добрая палова вершаў прысвечаная блізкаму ёй па духу Анатолю Сысу. Дарэчы, яшчэ некалькі аўтараў паэтычнага раздзелу «Палаца» прысвяцілі свае творы выбітнаму гарошкаўскаму паэту. Верш Алеся Бардоўскага, напрыклад:

Час пераблытаў колеры і стылі
І сам змяніўся — нават не пазнаць.
А сёння дык Сыса у школу
не пусцілі,
Дзе ён вучыўся думаць і пісаць...

Паэт са Светлагорску Вадзім Болбас узгадвае яго нават у Празе, дзе, цалкам у беларускай традыцыі, адчуў настальгію па радзіме.

Для Ганны Новік у вершы «Тут» горад над Сожам наўпрост атаясамліваецца з Анатолем Сысом («...Тут Сыс Анатоль атумечыў па парку...»). Вось толькі слова «атумечыў» не дае мне спакою — аніяк не магу дайсці да яго сэнсу.

Застаецца шкадаваць, што для вершаў аднаго з найлепшых паэтаў нашага часу Анатоля Сыса не знайшлося ў альманаху ні лапіка месца, нават у раздзеле «Спадчына». Шчыра спадзяюся, што выдаўцы выправяць такую недарэчнасць у наступным нумары альманаха.

Адметныя сваім гучаннем творы маладзейшых паэтаў, прадстаўленыя ў альманаху: постмадэрністкі Ганны Новік, выхаванкі «Бум-Бам-Літу» Арыі-Ульрыкі Гатальскай, у якой прачнулася другое дыханне, пачаткоўца Аляксея Дужага.

Вылучаюцца непадобным стылем мае даўнія творчыя сябрукі, якія пішуць збольшага на расійскай мове — Сяргей Краснабарод і паэт унікальнага лёсу, пустэльнік Уладзімер Агафонаў, вершы якога мне давялося перастрараць па-беларуску.

Прыемная нечаканка паэтычнага раздзела — творы вядомага барда Андрэя Мельнікава. На маю думку, найбольш натхнёны Мельнікаў у вершах, якія прысвечаныя роднаму гораду — «Дарога на Гомель» і «Гомель».

Цікава зазірнуць і ў галерэю «Прозы». Раздзел адкрывае лоеўскі даўнар Міхась Даніленка. Ягоныя, у традыцыйным рэчышчы, апавяданні — лірычныя споведзі пра знітаванасць аўтара з прыродай роднага краю (цыкл «Дрэвы і людзі»). Грунтоўна прадстаўлены ў альманаху празаік Анатоль Бароўскі. Падступы да рамана «Туман» — пацвярджэнне трываласці творчага крэда аўтара: асабіста перажытае, лёсы землякоў, пошукі жыццёвага шляху.

Яркай бліскавіцай уварваўся на старонкі «Палаца» няўрымслівы і крыху загадкавы Сяргей Балахонаў, які даўно выпрацаваў свой адметны і пазнавальны стыль. У альманаху ён публікуе фрагмент рамана «Інфанта і аднарог» (пад назвай «У горадзе лоўчых сноў»). У сучаснае жыццё з волі аўтара ўплятаецца старадаўняя гісторыя і прымушае героя твора на сабе адчуць ейны подых... аж да мурашак па скуры.

Кранае шчырасцю апавяданне Алеся Брагінца «Надзечка»; па-свойму прыцягальная проза Уладзіміра Лякіна ды Язэпа Крупы.

Раздзел «Спадчына» прадстаўлены годнымі і, на жаль, крыху призабытымі імёнамі, чыя проза і паэзія тым не меней узбагачае творчы набытак Гомельшчыны: празаік Іван Сяркоў, празаік і гумарыст Леанід Гаўрылкін, паэты Іван Кірэйчык і Уладзімір Верамейчык.

Неблагое, аднак супярэчлівае, уражанне пакідае літаратуразнаўчы раздзел. Дацэнт ГДУ імя Скарыны Дзмітрый Паўлавец знаёміць чытача з «Вандроўкай па Палессі з Іванам Мележам»; Ірына Бароўская шукае новае ў беларускай песеннай лірыцы (даследаванне «Слова паэта песняй адгукнецца...»); асэнсоўвае феномен кахання ў творах сучасных беларускіх пісьменніцаў Таццяна Фітцнер. Аднак ад гэтага раздзела чакалася большага...


Вядома, няўдзячная справа даваць парады, няхай сабе і землякам, але не магу не адзначыць, што незаслужана пакінуты па-за ўвагай укладальнікаў раздзел «Драматургія». Апроч драматургіі, у зборнік варта было б улучыць і літаратурныя пераклады. Увогуле, калі казаць пра жанравую разнастайнасць такіх выданняў, выдаўцам «Палаца» варта было б скарыстацца з досведу берасцейскай «Жырандолі», якая выдаецца пяць гадоў запар, ды змясціць раздзел публіцыстыкі, а таксама штосьці з хронікі літаратурнага жыцця. Вось тады завіруе на старонках «Палаца» жывы, рэальна-асязальны складнік літаратурнага працэсу...

Больш грунтоўнае асэнсаванне мастацкіх вартасцяў новага альманаха будзе зроблена чытачамі і крытыкамі. Пакуль жа зазначу відавочнае: гомельскі літаратурны альманах «Палац» выглядае больш цэласным і ўдалым на фоне ранейшых спробаў. З'яўленне яго — падзея значная не толькі для літаратурнай Гомельшчыны, але і для ўсёй «правінцыйнай» літаратуры ўвогуле. Хаця і з яе «правінцыйнасцю» трэба даўно развітацца.

Ён ратаваўся беларускасцю

Сяргей ЧЫГРЫН

Цудоўную кнігу трымаю ў руках. Яна прысвечана памяці выдатнага беларускага празаіка, паэта, публіцыста, перакладчыка, фалькларыста, журналіста з Беласточчыны Міколы Гайдука (1931-1998). Таго самага Гайдука, які ведаў увесь беларускі свет Польшчы, якога ведала Беларусь. А кніга гэта мае назву «У беларускасці наш паратунак».



Кніга ўспамінаў пра Міколу Гайдука пабачыла свет у Беластоку — дзякуючы руплівіцы Лене Глагоўскай, паэту Віктару Шведу і апантанай беларускасцю і нашай роднасцю Валянціне Швед.

Пра Міколу Гайдука і Падляшша напісалі Дарафей Фіёнік, Анджэліка Масальская, Славамір Іванюк ды іншыя аўтары. Яўген Вапа распавёў пра яго як журналіста тыднёвіка «Ніва», а Юрка Хмялеўскі — пра творчую сувязь Міколы Гайдука з «Czasopisam», Яўген Чыквін — пра супрацоўніцтва яго з асяроддзем «Przegląd Prawosławny»...

Другі раздзел кнігі «У беларускасці наш паратунак» прысвечаны ўласна ўспамінам. Віктар Швед распавядае пра апошні дзень жыцця Міколы: калі ён памёр у лесе з поўным кошыкам грыбоў. А Янка Целушэцкі ўспамінае, як стукнуўся вечарам Мікола на сваім самаходзе ў паліцэйскую машыну (у той час, калі паліцыянты мянялі ў ёй колы). Васіль Петручук прыгадаў, як з Міколам пасваруўся ў «Ніве». А Міра Лукша прызналася, што «з яго падручнікаў вучыліся мы, якія сталі яго калегамі, хоць крышачку набраўшыся ў яго імпэту і пільнасці». Мікалай Панфілюк успомніў буквар Міколы і Лідзіі Гайдукоў, які «пахне роднай Беласточчынай, мовай, зямелькай, нівамі і праўдай». А Надзя Запруднік успомніла той час, калі яна была ў Беластоку і гасцявала ў доме Гайдукоў, а Мікола ёй падараваў клубок нітак «на свэтар ад сваіх авечак»...

Трэці раздзел — раздзел прысвячэнняў Міколу Гайдуку. Ён, на жаль, самы слабы ў кнізе. Творы даволі кволыя — за выключэннем хіба двух вершаў Віктара Шведа і верша Сяргея Панізніка.

Раздзел «З эпісталярнай спадчыны» пачынаецца лістамі Валянціны Трыгубовіч і Валянціны Пашкевіч. Валянціна Трыгубовіч (ліст ад 30 лістапада 1980 года) распавядае пра юбілейную вечарыну Уладзіміра Караткевіча ў мінскім Доме літаратара. Валянціна Пашкевіч паведамляе з Мінска Міколу пра прыезд напрыканцы 1980-х гадоў у Мінск спевака Данчыка, пра выхад часопіса «Спадчына», пра сварку Міколы Шэляговіча з Іванам Чыгрынавым, пра Чарнобыльскі шлях, калона якога была ад Палаца прафсаюзаў да плошчы Перамогі.

У 1983 годзе з Нямеччыны Юрый Попка (1912–1990) паведаміў пра тое, як збірае экспанаты для свайго Беларускага музея Інстытута беларусаведы ў Ляймане. Ён радаваўся кожнаму беларускаму экспанату. Але ў яго лістах прысутнічаў і адчай: «На вялікі жаль, з беларусаў і беларусак, што жывуць у Нямеччыне, яшчэ ніхто не адведаў ані музею, ані памятніка, хоць я іх запрашаў. Адзін толькі прафесар Барыс Кіт наведвае і дапамагае мне».

24 лістапада 1985 года Мікола Гайдук адказвае Юрыю Попку, дзе з вялікай горыччу паведамляе пра смерць Юркі Геніюша і адначасова выказвае свае думкі-разважанні наконт яго смерці: «...Некалькімі днямі перад смерцю ён зайшоў у «Ніву» і падчас звычайнай сяброўскай размовы таямніча мне шапнуў: «У мяне былі госці. Узламалі дзверы. Атруцілі сабаку. Перацрэслі ўсё ў хаце, грэбліся ў паперах. Шукалі невядома чаго. На шчасце, я застаў. Яны ўцяклі...». Калі гэта звычайныя госці, то не мусілі доўга капацца, бо ў кватэры Геніюшаў каштоўнасці ўсе на сценах: зборы старажытных іконаў, якім вартасці няма, ды іншыя каштоўныя старажытнасці ўверсе. Чаму смерць Юркі наступіла ў некалькі дзён пасля гэтага рабунковага нападу?..».

У кнізе апублікаваны і пісьмы Юркі Рапецкага, Міхася Раецкага, Янкі Мойсіка, Надзі Кудасавай, Пётры Кажуры, Мацея Канапацкага, Уладзіміра Гайдука, Зоські Верас, Лявона Луцкевіча. Эпісталярная спадчына Міколы Гайдука — гэта сапраўдныя, гістарычныя дакументы.

Пяты раздзел кнігі «З рукапіснай і машынапіснай спадчыны» складаецца з чатырох твораў Міколы Гайдука. Найбольш цікавыя — тэкст пра мітрапаліта Васіля Дарашкевіча (мітрапаліт Васіль заснаваў Варшаўскую праваслаўную семінарыю і вучыў у ёй на беларускай мове, захапляўся беларускай паэзіяй, а «Новую зямлю» Якуба Коласа ведаў на памяць, ён аднаўляў і адбудоўваў праваслаўныя храмы ў Польшчы), а таксама прамова Міколы Гайдука на Першым з'ездзе беларускіх студэнтаў у Польшчы ў 1987 годзе.

У апошні раздзел кнігі «У беларускасці наш паратунак» («Альбом») увайшлі здымкі Міколы Гайдука ад маленства да апошніх дзён.

Некалі амерыканскі прадпрымальнік Стыў Джобс сказаў: «Мая праца — не палягчаць жыццё людзям. Мая праца — рабіць людзей лепшымі». Лепшымі людзьмі стараўся рабіць усіх нас і шматгадовы апантаны збіральнік беларускасці Падляшша Мікола Гайдук. У вянок ягонай памяці — і новае выданне.

Жывая чарга

Іван МЕЛЬНІЧУК

За костачку

Шчанюк, што пільнаваў старанна дом,
Сабачыя засвоіўшы навукі,
Знаў, гаўкнуць дзе,
а дзе вільнуць хвастом,
Каму лізнуць працягнутыя рукі.
Глядзеў шчанюк на справу досыць проста:
Якая служба — гэткай будзе костка.

Перасцярога

Зачараваўшы зайчыка, удаў
І піскнуць нават беднаму не даў.
Ці змей перад табою,
ці драпежны звер —
У дабрату ягоную не вер.

Жывая чарга

«Адно акно» — і зноўку па чарзе.
Чарга «жывая» тая ледзь паўзе,
Бо без чаргі абслужаць брата, свата,
Знаёмых — іх у кожнага багата.
Не дзіва, што чарга «жывая» тая
Чамусьці аніяк не аджывае.

Плачу

Хачу таго, ці не хачу —
За ўсё па цэнніку плачу:
За хлеб плачу,
За соль плачу,
За яблыкі, за алычу
Плачу,
Плачу за бульбу
І гарох,
Што даў сам
Літасцівы Бог.
Свідруюць зуб —
Ледзь не вішчу,
За экзекуцыі плачу.
Шалеюць цэны —
Зноў бурчу,
Хоць ледзь не пла́чу,
А плачу.
І толькі цешуся
Адным —
Без пла́ты дыхаць
Можна ўсім.

Ваяка

«Я ветэран — Кузьма дэкламаваў —
Усё жыццё я ваяваў...»
— А з кім? — спытаў Сымонка.
— Са сном. З начальствам. З жонкай.

Асцярожны

Тлумачыў шэф, што на рабоце
Ён нібы той цыркач на дроце:
Баіцца ў лічбах памыліцца,
Болей за ўсё — дарэшты спіцца.

Дыялог

Пеця радаваў Святлану:
«Хочаш, зорачку дастану?!..»
А яна: «Хай зоркі свецяць.
Лепш дастань мне футра, Пеця.»

Многавектарны

Каханак многа меў Пятроў —
Ад маладух і бабак без зубоў.
Тлумачыў: «Я не ветраны.
Я проста многавектарны.»

Асілак

Дзед Яфрэм набраўся духу, —
Клікнуў танчыць маладуху.
З танцаў жа таго «асілка»
Адпраўлялі на насілках.

Прадпрымальнік

Прадаваў дзядуля хрэн.
Думаў, будзе бізнэсмэн.
Бабка «ка́су» адшукала —
Цалкам прыхватызавала.

Хвалько

Хваліўся шпак: «Да ураджаю
Я дачыненне першы маю, —
Вясну вітаю».

Воўчая філасофія

Даказваў воўк: пагана жыць,
Калі няма каго душыць.

Не той разлік

Прасіў, каб Бог памог,
А сам у цянёк прылёг.

Першапраходзец

Дзед, прыехаўшы з курорта,
Па сяле бадзяўся ў шортах.
Бабы кпілі: «Пэўна, кра́лі
Калашыны адарвалі...»

Памылковы намер

Марыў аб шчасці,
А намерыўся красці.

Не тая апора

Як галава «кульгае»,
І кульба не памагае.

Знаходлівы

Капаў дзівак глыбокі роў,
Хавацца каб... ад камароў.

Без разбору

Галоднаму не цікава:
Смачней гарбата ці кава.

Успамін

І пень помніў, што па сасне помнік.

Інфарматары

І плёткі часам маюць рацыю —
Хутчэй даводзяць інфармацыю.

Уцякач

Сяргей БЕЛАЯР

Свабода пачынаецца з іроніі.
Віктор Гюго

— Гэта што такое? — адарвалася ад сняданку майстар цэха па вытворчасці лямп агульнага прызначэння. На наладчыка яна глядзела як злачынца на міністра ўнутраных спраў.

— Гэта — заява на звальненне, Марына Мікалаеўна! — патлумачыў Мікіта Лугавін.

— Якое яшчэ звальненне?

— Мяне не задавальняюць пяць даляраў заробку, дванаццацігадзінны працоўны дзень пры адным выхадным у год, плата ў пяцьдзясят еўра за права працаваць на заводзе! Мяне ванітуе ад прафнепрыдатнасці кіраўніцтва! А яшчэ я не хачу жыць у інтэрнаце на тэрыторыі завода!

— Што? — Марына Мікалаеўна павольна ўзнялася над сталом. Тварам яна стала падобная на індуісцкую багіню Калі. Мікіта Лугавін інстынктыўна адхіснуўся. — Ты не разумнічай!.. І наогул — ідзі да старшага майстра!

Барана Мікіта Лугавін пасля трохгадзінных пошукаў знайшоў у слясарнай майстэрні.

— Павел Бухалавіч, падпішыце заяву!

Баран з цяжкасцю ўзняў галаву і пасля тузіна спробаў сфакусаваў погляд на наладчыку.

— Не падпішу! У цябе кантрафакт... кантрабас... кантракт на дваццаць пяць гадоў! — амбрэ ад сівушных масел літаральна валіла з ног. — А ты адпрацаваў усяго адзін год!

— Але я хачу звольніцца!

— Да канца к-а-н-т-р-а-к-т-а не маеш права! — сказаў Баран і, абсмаліўшы вейкі і бровы, падпаліў цыгару «Cohiba Behike» ад запальніцы з васямнаццацікаратнага белага золата, інкруставанай пяцюстамі брыльянтамі.

— Гэта феадалізм! — закрычаў Мікіта Лугавін, абудзіўшы гномаў-слесараў. Тыя неадкладна пачалі скручваць стартар з мэтай абмену яго на спіртазмяшчальную вадкасць.

— Завалі хлябала і бегам марш працаваць! — Баран зрабіў зацяжку і выдыхнуў у твар Мікіце Лугавіну. Наладчык ледзь стрымаўся ад таго, каб не даць старшаму майстру ў твар, што тры месяцы не ведаў брытвы.

— Я ўсё роўна звольнюся!

— Толькі па артыкуле!..

Мікіта Лугавін плюнуў і накіраваўся да намесніка начальніка цэха.

Цэх нагадваў Даліну смерці. Лініі, атрыманыя па рэпарацыях з Германіі па Версальскай мірнай дамове, вывяргалі змрочны агонь, з трубаў біў круты кіпень, цеплавыя гарматы нагняталі распаленае паветра — з завода зберглі ўсе спецыялісты, якія маглі іх адключыць, з дзір у падлозе раз-пораз выплюхвалася лава.

У цэху смярдзела алейнай фарбай — грэмліны-наладчыкі фарбавалі лініі проста па брудзе і пыле, спяшаючыся навесці глянец да прыезду чарговай камісіі з міністэрства. Пахла і газай — ёй націралі падлогу для надання бляску і 5D-эфекту.

Спроба абудзіць Таўсталобіка, які атрымаў сінекуру дзякуючы знаёмству з сынам дырэктара, пацярпела фіяска. Спаў намеснік начальніка цэха моцна па-за залежнасцю ад часу сутак, а тоўстыя дубовыя дзверы адсякалі любыя гукі...

Мікіта Лугавін прыгнечана паківаў галавой і падняўся ў пентхаўс да дырэктара. Ля дзвярэй у апартаменты кіраўніка ААТ наладчыка спынілі ахоўнікі.



— Ходу няма! — паўзброены шматствольнай аркебузай, шастапёрам, бензапілой «Дружба» і ручнымі ядзернымі гранатамі тэрмінатар Т-1.

— Мне вельмі трэба!

— Дырэктар заняты — ён трэція суткі лічыць сваю зарплату! Заходзьце праз два дні!

— Але...

Віскнула бензапіла, і Мікіта Лугавін паспяшаўся рэціравацца.

Наведванне дырэктара было апошнім легальным спосабам звольніцца з заводу. І Мікіта Лугавін прыняў рашэнне збегчы. Шлях да свабоды перакрывала бетонная сцяна дзесяці метраў вышынёй. Паверсе была нацягнута спіраль Бруна і праз кожныя пяць метраў высілася будка ахоўніка. Ні стволы буйнакаліберных кулямётаў, ні чалавечыя шкілеты на «калючцы», ні вышыня плоту Мікіту Лугавіна не спалохалі...

План быў выдатны, аднак наладчык пераацаніў свае сілы — паваліўся як падкошаны, не адолеўшы нават і трэціны шляху.

— Жывы? — голас Марыны Мікалаеўны пазбавіў наладчыка ўсялякіх надзей на тое, што ён трапіў у рай. З-за брэху заводтэр'ераў майстру даваўлося крычаць.

— Жывы! — запэўніў начальнік аховы Кашчэй Бессмяротны. — У кіназалу яго!

Ахоўнікі прышпілілі Мікіту Лугавіна тоўстымі скуранымі рамянямі да крэсла і ўключылі відэамагнітафон. Пакаранне за спробу ўцёкаў майстар цэха прыдумала жорсткае: глядзець «Дом-2».

Калі катаванне скончылася, Мікіта Лугавін адчуваў сябе выціснутай анучай. Але надзею вырвацца на волю не страціў. Спаслаўшыся на хваробу, наладчык накіраваўся ў медыцынскі пункт, якім загадваў фельчар-практолаг Таблеткін.

— Доктар, тэрмінова накіруйце мяне ў бальніцу! Паміраю!

— Спакой, толькі спакой! Які орган канкрэтна ў вас баліць?

— Усё!

— У такім выпадку вам трэба выпіць аналгін! Тры таблеткі, і зможаце вярнуцца да працы!..

— Што ж рабіць? — Мікіта Лугавін быў блізкі да істэрыкі. І тут погляд наладчыка спыніўся на калоне з трыццаці бартавых БелАЗаў, якія вывозілі смецце, што засталося пасля ўчорашняй змены. Нядоўга думаючы, ён залез у кузаў і закапаўся ў ракавінах вустрыц, з'едзеных за сняданкам васьмідзесяццю трыма намеснікамі кіраўніка прадпрыемства.

Бартавыя таксы-ваўкадавы аказаліся на вышыні — яны ўчулі наладчыка ўжо за дванаццаць кіламетраў ад прахадной.

— Збор твораў Дар'і Данцовай яму! — загадала Марына Мікалаеўна, даядаючы халву з пачкі вагой у пяцьдзясят кілаграмаў. — Хай чытае і канспектуе!

Ахоўнікі накінуліся на наладчыка і звязалі яго танкавымі трасамі, пасля чаго пацягнулі ў кабінет майстра. У куце ў абдымку са скрадзеным, але пакуль не прададзеным мяшком цэменту спаў Баран. Ад п'янага храпу майстра дрыжалі зваравыя з тытанавых лістоў сцены.

Чакаць, пакуль Мікіта Лугавін прачытае ўсе кнігі, ахоўнікі не сталі. Што не магло не радаваць наладчыка.

У наступныя чатыры гадзіны Мікіта Лугавін здзейсніў шэраг парушэнняў унутранага распарадку: курыў, гуляў у карты, катаўся па цэху на бульдозеры, нецэнзурна лаяўся, піў гарэлку з улюбёнцам завода парасём Сан Санычам, абарваў гігантскую расцяжку «2+2=5», накідаў смецця на працоўным месцы, ігнараваў правілы дарожнага руху, паліў вогнішчы, не мыў рукі, чытаў Салжаніцына, абедаў даўжэй за тры хвіліны, гучна пляскаў дзвярыма, думаў і шмат чаго яшчэ.

— За ўсе парушэнні мы пазбавім цябе заробку! — сказала Марына Мікалаеўна, даядаючы сланавы кумпяк.

— Лепш звольніце мяне!

— Хрэн табе!

На лінію, якая сілкавалася ад дзвюх АЭС, Мікіта Лугавін не вярнуўся. Ногі самі прывялі ў курылку.

— Ты чаго нос павесіў? — спагадліва спытаў дамавік Скрышытэк, які развозіў па цэхах гафраманжэту і кардонныя скрыні.

— Не звальняюць! — наладчык сцісла распавёў пра свае нягоды.

— Невялікая бяда!.. Вось табе цвік! Сіні «Ікс пяты» ведаеш?

— «БМВ» Таўсталобіка?

— Ён самы! Падрапай, і ты вольны! Вылеціш з завода як корак!

— Дзякуй! — І Мікіта Лугавін панёсся да службовай стаянкі...

ПРЭМІІ

Прэмія памяці Астрыд Ліндгрэн

Міжнародная літаратурная прэмія памяці знакамітай шведскай дзіцячай пісьменніцы Астрыд Ліндгрэн прысуджана шведскай пісьменніцы Барбру Ліндгрэн.

Кнігі Барбру Ліндгрэн перакладзены на 30 моў. Як прызналіся члены журы, шведская пісьменніца «з'яўляецца літаратурным наватарам», якая «з лінгвістычнай дзёрзкасцю і псіхалагічнымі нюансамі абнавіла не толькі кнігі для самых маленькіх, але і для падлеткаў».

Барбру Ліндгрэн нарадзілася ў 1937 годзе каля Стакгольма. Дэбютавала ў 1965-м з кнігай для дзяцей «Лета Мацiаса». За сваю творчую біяграфію апублікавала каля 100 кніг, сярод якіх ілюстраваныя выданні для малых, дзіцячая паэзія і п'есы, апавяданні для дзяцей і дарослых.

Міжнародную літаратурную прэмію памяці Астрыд Ліндгрэн шведскі ўрад заснаваў у 2002 годзе (пасля смерці пісьменніцы), каб садзейнічаць развіццю дзіцячай і юначай літаратуры. Прэмія стала таксама знакам прызнання Астрыд Ліндгрэн, якая застаецца адной з самых любімых пісьменніц як у Швецыі, так і за яе межамі. Гісторыі, напісаныя Астрыд Ліндгрэн, перакладзены на больш за 90 моў свету.

Прэмія лічыцца адной з найбуйнейшых у галіне літаратуры. Сума грашовай узнагароды складае 5 мільёнаў шведскіх крон (770 тысячаў даляраў ЗША). Цырымонія ўзнагароджання пройдзе ў Стакгольме 2 чэрвеня.

«Folio»

Амерыканскі празаік Джордж Сондэрс стаў уладальнікам літаратурнай прэміі «Folio», якая была заснаваная летась як альтэрнатыва папулярнаму «Букеру».

Узнагарода пісьменніку ўручана за кнігу «Дзясятае снежня». Выданне было адзіным зборнікам апавяданняў, якія ўвайшлі ў шорт-ліст прэміі. Выбар журы, на думку сайта «Новости литературы», сведчыць пра тое, што ў свеце вяртаецца цікавасць да фармату кароткага аповеду (Нобелеўская прэмія па літаратуры, уручаная Эліс Манро – яшчэ адно пацверджанне гэтага факту).

Па словах заснавальніка ўзнагароды Эндру Кідда, новая літаратурная прэмія для англамоўных аўтараў – акадэмічная альтэрнатыва «Man Booker Prize», прэстыжнай, але не занадта папулярнай, і «Букеру», лонг-лісты якога з кожным годам становяцца ўсё больш «папсовымі». Адзначаецца, што ў шорт-ліст першага сезона «Folio» ўвайшлі пяць аўтараў з ЗША, два брытанскіх і адзін канадскі пісьменнік. Джордж Сондэрс – амерыканец.

Паэтка Лавінія Грынлоў, старшыня журы, каментуючы выбар «Folio», заявіла: «Гэтыя апавяданні – адначасова па-майстэрску напісаныя і глыбокія. Мы не сумняваемся, што з гадамі іх значэнне будзе толькі ўзмацняцца». Апроч дыплома, Сондэрс атрымаў фінансавую ўзнагароду ў памеры 40 000 фунтаў стэрлінгаў (каля 70 000 даляраў ЗША).

«Руская прэмія»

Кароткі спіс прэтэндэнтаў на званне лаўрэатаў міжнароднага літаратурнага конкурса «Руская прэмія» за 2013 год абвешчаны ў Маскве. Гэта творчае спаборніцтва арганізаванае пры падтрымцы Прэзідэнцкага цэнтра Барыса Ельцына і праходзіць ужо ў дзявяты раз.

Старшыня журы конкурса Сяргей Чупрынін адзначыў, што праца па вызначэнні прэтэндэнтаў праходзіць у дыстанцыйным рэжыме: кожны выстаўляе адзнакі намінантам па сваім меркаванні, а затым балы сумуюцца.

Па рашэнні журы сёлета ў кароткі спіс конкурса ўвайшлі творы дзевяці расійскамоўных пісьменнікаў і паэтаў з шасці краін свету.

У намінацыі «Паэзія» ў спіс увайшлі Шамшад Абдулаеў з Узбекістана, Ніджат Мамедаў з Азербайджана і Андрэй Палякоў з Украіны. Спашукальнікамі на галоўны прыз у намінацыі «Малая проза» сталі Ілля Одзегаў з Казахстана за зборнік апавяданняў «Цімур і яго лета», Аляксандр Сцесін з ЗША за кнігу «Вярніся і вазьмі», а таксама Алена Сцяжкіна з Украіны за аповесці з цыклу «Адзін талент». У кароткі спіс прэміі ў намінацыі «Вялікая проза» ўвайшлі Валерый Бачкоў з ЗША («На поўдзень ад Вірджыніі»), Аляксей Нікіцін з Украіны («Victory park»), Саша Філіпенка з Беларусі («Былы сын»).

Такім чынам, больш за ўсё намінантаў на прэмію – з Украіны.

Адмысловым прызам аргкамітэта і журы конкурса «За ўнёсак у развіццё і захаванне традыцый рускай культуры за межамі Расійскай Федэрацыі» быў узнагараваны Жорж Ніва. Ён адзначаны за перакладніцкую дзейнасць.

На што жывуць нямецкія паэты?

«Не прадаецца натхненне, але можна рукапіс прадаць», – пісаў паэт. А што рабіць, калі за рукапіс плацяць сімвалічныя грошы або наогул – нічога? На што жывуць, напрыклад, паэты ў Нямеччыне? Штогод там прысуджаюцца і ўручаюцца каля ста літаратурных прэмій і стыпендый.

У Нямеччыне кожны год выходзіць каля паўтысячы паэтычных зборнікаў. Статыстыка ахоплівае, зразумела, толькі камерцыйныя выданні, якія паступаюць у продаж. Лічыцца, што яшчэ столькі ж вершаваных кніг іх аўтары выдаюць самі, за свой кошт (магчымасцяў у Нямеччыне для гэтага вельмі шмат, а каштуе такі «самвыдат» для немцаў літаральна капейкі).

Значная частка вершаваных томікаў, якія з'яўляюцца на прылаўках нямецкіх кнігарняў, – гэта, вядома ж, кнігі паэтаў-класікаў, якіх ужо няма на нашай грэшнай зямлі. Але іншыя паэты, якія яшчэ жывуць, атрымліваюць ад выдавецтваў ганарары. Аднак жыць на іх немагчыма. Паэтычныя зборнікі прадаюцца слаба, ды і кошт у іх нізкі, так што за зборнік, выдадзены накладам 1000 асобнікаў, аўтар атрымлівае звычайна ад выдавецтва ад 500 да 1000 еўра. І калі нават шчаслівчык будзе выдаваць вершаваныя зборнікі кожныя 3–4 месяцы, яго ганарар ледзь перавысіць пражытковы мінімум у Нямеччыне...

Многія нямецкія паэты з задавальненнем выступаюць перад чытачамі: большасць – бясплатна, але самыя папулярныя атрымліваюць ад кнігарняў, бібліятэк ганарары за выступы. Звычайна плацяць 100–200 еўра за вечар. Калі выступ арганізоўвае які-небудзь багаты культурны фонд ці музей, могуць заплаціць і 500 еўра. Але такія выступы здараюцца не часта, ды і канкурэнцыя высокая.


Дык на што ж жывуць нямецкія паэты?

Хто як. Даўно прайшлі тыя часы, калі літаратараў утрымоўвалі мецэнаты (як, напрыклад, Рыльке ці Клопштока, якому прызначыў пажыццёвую рэнту дацкі кароль). Праўда, сёння ў Нямеччыне існуюць разнастайныя стыпендыі для дзеячаў мастацтва, але іх не так шмат і плацяць іх абмежаваны час – максімум год.

Хтосьці з паэтаў жыве на сацыяльную дапамогу. Гэта 300–400 еўра ў месяц плюс, сама меней, частка кватрплаты, бясплатная медыцынская страхоўка. Не густа, затое не трэба хадзіць на працу, можна з раніцы да вечара рыфмаваць, рыфмаваць, рыфмаваць...

Дарэчы, літаратурныя прэміі, якіх у Нямеччыне многа, дапамагаюць маладым і масцітым літаратарам – некаторыя з іх складаюць у грашовым эквіваленце некалькі дзясяткаў тысяч еўра...

Суперкніга XVI стагоддзя



У XVI стагоддзі існавала кніга, якую можна было чытаць шасцю рознымі спосабамі.

Метад змацавання лістоў dos-a-dos (у перакладзе з французскага — «спіна да спіны») у Сярэднявеччы выкарыстоўваўся, звычайна, толькі для дзвюх кніг, якія неабходна было аб'ядаць пад адной вокладкай. У нацыянальнай бібліятэцы Швецыі захоўваецца кніга, якая злучае адразу шэсць выданняў: чытаць яе, адпаведна, можна шасцю рознымі спосабамі.

Выданне змацавана металічнымі сашчэпамі: адкрыўшы любую пару суседніх замкоў, можна прачытаць тую ці іншую публікацыю.

Выявіў кнігу і заняўся яе вывучэннем Эрык Квакел, супрацоўнік Лейдэнскага ўніверсітэта. Навуковец быў здзіўлены ўнікальнасцю, узростам і ступенню захаванасці выдання, якое стваралася ў 1550–1570-х гадах.

У наш час доступ да кнігі абмежаваны.

З 1958 года кніга распаўсюджвалася ў еўрапейскіх краінах, у прыватнасці — у кішэннай версіі.

ЦРУ і «Доктар Жывага»

У гады «халоднай вайны» ЦРУ выдавала раман «Доктар Жывага», які быў забаронены ў СССР. ЦРУ выкарыстоўвала кнігу для ідэалагічнай барацьбы з Савецкім Саюзам.

Літаратары Пітэр Фін і Петры Коўві напісалі аб тым кнігу, дзе распавялі пра 130 нядаўна рассакрэчаных дакументаў ЦРУ. У іх апісваюцца асабліваці публікацыі і распаўсюду «Доктара Жывага» ў мэтах антысавецкай прапаганды.

«Мы можам прымусіць савецкіх грамадзянаў СССР задумацца над дзеяннямі савецкіх уладаў, калі выдатная кніга, напісаная найвялікім з расійскіх літаратараў, не можа быць апублікавана ў яго ўласнай краіне, на яго мове і для яго народа», — гаворыцца ў адным з рассакрэчаных дакументаў. ЦРУ аддрукавала наклад кнігі ў Галандыі, каб «рука ЗША не была заўважана ў гэтай справе».

Перадгісторыя «Знесеных ветрам»

Спадчыннікі Маргарэт Мітчэл ухвалілі выпуск прыквела (перадгісторыі) да «Знесеных ветрам». Аўтарам новай кнігі стаў Дональд Маккейг (пісьменнік, які раней ужо выдаў два працягі культавага рамана: «Рэт Батлер» і «Людзі Батлера»).

Кніга Маккейга, выдавецкая назва якой — «Вандраванне Рут», распавядзе пра падзеі, якія папярэднічаюць сюжэту рамана «Знесеныя ветрам». Галоўнай гераіняй рамана стане Мамка, чарнаскурая рабыня, гісторыя якой у арыгінальнай кнізе Мітчэл, выдадзенай у 1936 годзе, не раскрывалася. Дональд Маккейг апісаў біяграфію Рут ад нараджэння да з'яўлення ў доме О'Хара. Кніга выйдзе ў канцы 2014 года.

15-мятровая кніга-вышыванка

Ва Украіне стварылі 15-мятровую вышытую кнігу.

Да 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі ў горадзе Арэхаў Запарожскай вобласці прэзентавалі кнігу-буклет з 24 старонак. Яе даўжыня перавышае 15 метраў, а вага — 8 кг. На кожнай старонцы кнігі — вышытыя ўручную вершы Кабзара і ілюстрацыі да іх.

Па словах Лідзіі Млынар, галоўнага метадыста Палаца культуры Арэхава, да 200-годдзя з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі гэтую кнігу вышывалі ўсёй грамадою.

Кніга стала самым доўгім ва Украіне ілюстраваным выданнем вершаў Тараса Шаўчэнкі. Неўзабаве яна адправіцца ў Кіеў.

Памяць пра Івана Шмялёва

Ва Уладзіміры (Расія) на доме, дзе каля васьмі гадоў жыў Іван Шмялёў, усталявана мемарыяльная шыльда.

Пісьменнік (аўтар «Сонца мёртвых» і іншых вядомых кніг) быў службоўцам па адмысловых даручэннях Уладзімірскай казённай палаты. Акцыя, якая прайшла ў межах Года культуры, — вынік сумесных высілкаў Асацыяцыі юрыстаў Уладзімірскай вобласці, Грамадскай палаты пры абласной адміністрацыі і Расійскага фонду культуры.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў www.novostiliteratury.ru, Washington Post, www.vsiknygy.net, www.dw.de, prostokniga.com, lenta.ru, ІТАР-ТАСС, РІА «Новости».

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by